# КАНСЦЫЕНТАЛЬНАЯ ВАЙНА І ПРАПАГАНДА: ЗАДАЧЫ І ВЫКЛІКІ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

**Павел Баркоўскі**[1]

**Abstract**

Nowadays there are a number of concepts used in expert circles to define a new type of war without the usage of conventional lethal weapons: psychological, informational, netwar, cyberwar or combined strategies, like, hybrid wars. This list can be also complemented by the concepts used by Russian analysts – anonymous war, organizational warfare, and finally, the consciental war. The last type of war is not primarily focused on the physical destruction of the enemy, but creates a lasting effect of the propaganda on the proper and the enemy audience, which would allow changing significantly the mental schemes, prevailing values and ways of self-identification of people to control and manipulate their behavior. One of the fundamental issues of the topic is: why does the most reflective and critical thinking part of the society – the intellectuals – nevertheless turn into the victims of propaganda effects of the consciental war? To answer that question it was important to appeal to the modern concept of the theory of propaganda by J. Ellul, who confirmed that there are many possibilities of direct and indirect impact on the individual, even a highly reflective one in the modern propaganda. Finally, the last question concerns the possibility to protect oneself somehow from the effects of consciental warfare and their damaging effects? Both passive and active forms of protection were analyzed in the article.

**Keywords**: consciental war, informational war, propaganda, identity politics, intellectuals, semantic war.

«Вайна за розумы» адбываецца паводле ўласных законаў, і гэтыя законы адрозніваюцца ад прынцыпаў звычайнай прапаганды. Праўда, трэба адзначыць, што нават перад наўпростай прапагандай выстаяць бывае цяжка. Нават інтэлектуалам. Кансцыентальныя ж войны паступова набывалі сваю моц і абсяг на працягу XX стагоддзя, каб у стагоддзі XXI стацца фактам нашага існавання. Першыя высілкі ў гэтай галіне можна назіраць яшчэ за часамі сусветных войнаў, калі масавая ваенная прапаганда напярэдадні і на ранніх этапах вайсковых дзеянняў прыводзіла да эфектаў скажэння рэальнасці ў рэчышчы масава-патрыятычнай істэрыі. Гэты стан перажывалі вядомыя інтэлектуалы і дзеячы культуры розных

[1] Павел Баркоўскі – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (Мінск, Беларусь).

краін – і Нямеччыны, і Францыі, і Расіі: дастаткова, напрыклад, звярнуцца да лістоў і публічных выказванняў еўрапейскіх і расійскіх дзеячаў культуры у 1914 г.[2] Праз пэўнае змяненне свядомасці вялікая частка асвечанай публікі раптоўна пачынала ўспрымаць сваю краіну на лязе цывілізацыйнага змагання, новымі рымлянамі, што супрацьстаяць навале варвараў з усходу, захаду ці іншых частак свету, сябе – сумленнем нацыі, а іншадумцаў – калабарантамі і «пятай калонай», што працуюць няйнакш як на здраду нацыі. Трэба адзначыць, што найперш ахвярамі кансцыентальных войнаў ставаліся грамадзяне тых краін, што вялі войны фізічныя на рэальных палях вайны. Падобная апрацоўка свядомасці сваіх грамадзян уважалася за вельмі эфектыўны механізм нацыянальнай мабілізацыі, што для мадэрных войнаў было значнай дапамогай пры разгортванні саміх вайсковых дзеянняў. Але і тады вынікі падобнага змянення ментальнай рэальнасці былі вельмі значнымі: сотні публічных асоб, якія меліся ўвасабляць «гонар нацыі», на пэўны час рабіліся актыўнымі заўзятарамі дзяржаўнай палітыкі, барацьбітамі на віртуальным фронце супраць «варожай культуры» і ментальнасці.

Асобнай і самастойнай практыкай кансцыентальная вайна, хаця так яна тады і не звалася, зрабілася за часамі вайны халоднай, калі наўпроставае вайсковае змаганне дзяржаў-суперніц сталася з розных прычын немагчымым. І ставіла яна сабе за мэту стварэнне ментальнай канфрантацыі такога ўзроўню, які б зрабіў магчымыя спосабы вядзення «гарачай» вайны непатрэбнымі альбо незапатрабаванымі наогул праз псіхалагічны злом суперніка. Змены ў якасці і ўзроўні тагачаснай прапаганды і агітацыі, якія праводзіліся перадусім краінамі ЗША, СССР і КНР, не засталіся па-за ўвагай вядучых даследчыкаў, што прывяло да комплекснага пераасэнсавання самога паняцця прапаганды ў сацыялагічна-псіхалагічным аспекце[3].

Галоўнай мэтай гэтай працы з'яўляецца спроба зразумець такі параўнальна новы феномен, як «кансцыентальная вайна», механізмы і спосабы яе рэалізацыі, а таксама вызначыць месца і ролю інтэлектуалаў у часе вядзення войнаў падобнага кшталту. Адпаведна пастаўленай мэце трэба будзе акрэсліць тры важныя пункты ў даследаванні тэмы. Перш за ўсё папярэдне трэба вызначыць

---

2 О. Федянина, М. Бессмертная, Н. Солдатов: «Анна играет "Боже, царя храни", с удовольствием слушаю». Как деятели культуры России, Германии, Австрии, Франции и Англии встретили начало Первой мировой войны // *Коммерсантъ Weekend*, 10. Рэжым доступу: http://www.kommersant.ru/doc/2431993. Дата доступу: 20.10.2016

3 Найбольш значная праца ў гэтым кірунку належыць французскаму сацыёлагу, філосафу і грамадскаму дзеячу Жаку Элюлю: J. Ellul: *Propaganda: The Formation of Men's Attitudes*, Trans. Konrad Kellen & Jean Lerner. Vintage Books, New York 1973. Актуальнасць ягонага тэксту нават сёння шмат у чым грунтуецца на тым, што ён назіраў за паўстаннем самой падобнай практыкі яшчэ амаль «у чыстай форме», за часамі «халоднай вайны», і таму тыя ягоныя назіранні дапамагаюць высвятляць многія заблытаныя механізмы сучасных прапагандысцкіх схем.

месца такога паняцця, як «кансцыентальная вайна», у структуры нефізічных войнаў сучаснасці, што мае на ўвазе параўнанне яе з іншымі прыкладамі «войнаў за розумы» і змешаных форм вайны, а таксама ўдакладненне яе арыгінальнага зместу і характарыстык. У другім пункце варта будзе разгледзіць механізмы сучаснай прапаганды (са зваротам перадусім да канцэпцыі Ж. Элюля) дзеля таго, каб удакладніць асноўныя спосабы рэалізацыі кансцыентальных войнаў і паказаць дзейснасць іх уздзеяння нават на свядомасць інтэлектуалаў. У апошнім раздзеле неабходна будзе прааналізаваць, ці існуюць нейкія эфектыўныя спосабы супрацьдзеяння прапагандзе як сродку кансцыентальнай вайны і якую ролю мусяць заняць інтэлектуалы ў выпадку патраплення ў рэчышча падобных ваенных дзеянняў.

Апошняя папярэдняя заўвага павінна тычыцца таго, чаму нагул можна аднесці «кансцыентальную вайну», як, дарэчы, і іншыя формы негвалтоўных і нефізічных войн сучаснасці, да такой формы чалавечых зносін, як вайна. Сам гэты феномен стала суправаджае чалавечую гісторыю і ў некаторым сэнсе можа з'яўляцца адным з азначэнняў чалавечай культуры ў прынцыпе. Справа ў тым, што на сённяшняе ўспрыманне вайны пераважнай большасцю людзей уплываюць класічныя яе дэфініцыі, прывязаныя да прац Г. Гроцыя, Н. Макіявелі, К. фон Клаўзевіца (асабліва апошняга), і таму дасюль шматлікія слоўнікі хутчэй вызначаюць гэтае паняцце як «узброенае змаганне паміж дзвюма ці большай колькасцю дзяржаў і груп»[4]. Такое разуменне вайны нібыта пазбаўляе магчымасці казаць пра негвалтоўныя, ці нефізічныя формы змагання як пра легітымную вайну. Але ж у асяроддзі вайсковых экспертаў і аналітыкаў пашыраецца ўсведамленне таго, што сённяшнія формы ваенных дзеянняў у сітуацыі «новай вайны» (альбо немагчымасці вайны татальнай) усё больш нагадваюць складаныя формы супрацьстаяння варожых бакоў, і даць дакладнае вызначэнне таго, што ёсць вайна, сёння надзвычай цяжка[5]. Такі вядомы даследчык вайны ў гісторыі і сучаснасці, як Марцін ван Крэвельд, паказвае, што феномен вайны надзвычай глабальны ў чалавечым свеце, бо «вайна – гэта жыццё ва ўсіх яго праявах. З усіх існуючых на зямлі відаў дзейнасці толькі вайна адначасова і дазваляе, і патрабуе выкарыстоўваць напоўніцу ўсе чалавечыя якасці – і самыя шляхетныя, і самыя нізкія»[6].

---

4 *War* // Cambridge Dictionary, Cambridge University Press 2016. Рэжым доступу: http://dictionary.cambridge.org/dictionary/english/war. Дата доступу: 15.12.16.

5 Гэта адлюстроўвае, у прыватнасці, справаздача з міжнароднай вайсковай канферэнцыі Інстытута стратэгічных даследаванняў армейскага каледжа ЗША (Strategic Studies Institute (SSI) U.S. Army War College) «Вызначэнне вайны ў 21 ст.": Р.В. Арзуманян: Определение войны в 21 веке. Обзор XXI ежегодной конференции по стратегии Института стратегических исследований Армейского военного колледжа, 6-8 апреля 2010 // *Центр стратегических оценок и прогнозов*. Рэжым доступу: http://csef.ru/media/articles/1217/1217.pdf. Дата доступу: 20.10.2016.

6 М. ван Кревельд. *Трансформация войны*, М.: ИРИСЭН 2005, 255.

Паказваючы адыход ад ужо класічных канцэпцый і вызначэнняў вайны, аўтар зазначае, што паняцце аб звычайнай міждзяржаўнай вайне як вайсковым канфлікце варожых армій адыходзіць у гісторыю, і войны будучыні мусяць змяняць сваю прыроду. «У гэтых абставінах, – піша ён, – вайна будзе куды мацней закранаць большасць грамадзянскага насельніцтва ажно да таго, што гэтае паняцце знікне альбо зменіць свой сэнс. Вайна закране людзей усіх узростаў і абодвух полаў. Уздзеянне на іх будзе ажыццяўляцца не выпадкова і не ананімна з вялікай адлегласці, як у выпадку стратэгічных бамбардзіровак; яны стануцца непасрэднымі ўдзельнікамі, мэтамі і ахвярамі»[7]. Вядомая амерыканская даследчыца Мары Калдар наогул пазначае змяненне зместу традыцыйнага паняцця вайны з дапамогай тэрміну «новая вайна», якая вызначаецца для яе наступнымі праявамі: 1) у яе змаганні ўдзельнічаюць як дзяржаўныя, гэтак і недзяржаўныя агенты; 2) яна вядзецца не ў ідэалагічных мэтах, але праз усталяванне новай палітыкі ідэнтычнасці як змаганне за пэўныя сімвалы (labels); 3) нефізічны, але хутчэй палітычны і псіхалагічны кантроль над насельніцтвам праз атмасферу страху і тэрору; 4) фінансуецца не толькі за дзяржаўны кошт, але праз унёскі трэціх асоб і структур, зацікаўленых у працягу канфлікту[8]. Такія войны таксама часам называюць постмадэрнісцкімі, пірацкімі, гібрыднымі ці, у вайсковай тэрміналогіі вельмі паліткарэктна, канфліктамі нізкай ступені інтэнсіўнасці (low intensity conflict). У падобных акалічнасцях разуменне *вайны як групавога змагання, пры якім супраціўнікамі выкарыстоўваецца ўвесь магчымы арсенал сродкаў гвалтоўнага, псіхалагічнага, інфармацыйнага, ідэалагічна-прапагандысцкага і іншага ўздзеяння дзеля дасягнення мэт знішчэння, замірэння, кантролю над супернікам ці неабходным стратэгічным рэсурсам,* уяўляецца дастаткова адпаведным сучаснаму стану рэчаў, што дазваляе легітымна адносіць сюды і практыку вайны кансцыентальнай, пра якую пойдзе гаворка далей.

**1.**

Перад тым, як зрабіць спробу аналізу самога феномена кансцыентальнай вайны, яе наступстваў і спосабаў ёй супрацьстаяць, трэба акрэсліць кола падобных ёй па сутнасці феноменаў, якое адпаведным семантычным воблакам ахоплівае гэтую з'яву і залучае яе ў шчыльныя стасункі з іншымі рэчамі падобнага кшталту. Існуе досыць вялікая колькасць паняткаў і вызначэнняў, што да характарыстыкі тых формаў вядзення вайсковых дзеянняў, калі пераважнай арэнай змагання робяцца душы і розумы людзей. У англамоўнай літаратуры пашыраным з'яўляецца тэрмін «псіхалагічная вайна» (Psychological warfare (PSYWAR)) і вытворныя ад яго паняцці «псіхалагічныя аперацыі» (PSYOP), вайна «сэрцаў і розумаў»

7 Там жа, 229.
8 M. Kaldor: *New and Old Wars: Organized Violence in a Global Era*, Cambridge: Polity 2012.

(«Hearts and Minds») і г.д., якія звычайна выкарыстоўваюць, «каб адзначыць усялякае дзеянне, якое ажыццяўляецца пераважна псіхалагічнымі метадамі з мэтай выклікання запланаванай псіхалагічнай рэакцыі ў іншых людзей»[9]. Гэта мае на ўвазе перадусім сукупнасць метадаў першаснай дэмаралізацыі верагоднага супраціўніка, стварэнне эфектаў дэзарыентацыі, панікі і непадпарадкавання як спосабаў забяспечыць «перамогу без зброі» альбо «псіхалагічную перамогу» над ворагам: такім чынам, псіхалагічная вайна выступае як суправаджэнне альбо замена масавых баявых вайсковых дзеянняў. Хаця зараз гэты тэрмін можа выкарыстоўвацца і ў больш шырокім сэнсе, залучаючы ў сябе кампаненты палітычнага ціску, інфармацыйнага змагання, прапаганду і спецыяльныя аперацыі адмысловых службаў.

Бліжэй да канца XX ст. пачынаюць, аднак, з'яўляцца іншыя, больш адпаведныя лічбавай эпосе вызначэнні для падобных практык ажыццяўлення вайны без зброі. Напрыклад, тэрмін «сеткавая вайна» (netwar, альбо «роевая тактыка» – «swarm-tactics»), аднымі з аўтараў якога з'яўляюцца амерыканскія даследчыкі Дж. Аркіла і Д. Ронфельд, што «адсылае да паўсталага спосабу канфліктаў (і злачынстваў) на сацыетальным узроўні, пазбаўленага выкарыстання традыцыйнай вайсковай зброі, у якім яго заўзятары ўжываюць сеткавыя формы арганізацыі і адпаведныя дактрыны, стратэгіі і тэхналогіі, прыдатныя ў інфармацыйны век»[10]. Сеткавыя войны залучаюць у сабе гвалтоўныя дзеянні, якія вядуцца, з аднаго боку, тэрарыстамі, крыміналам, бандамі і этнічнымі экстрэмістамі, з іншага боку, актывістамі грамадзянскай супольнасці (напрыклад, кіберактывістамі). Адмысловай характарыстыкай падобнай вайны застаецца сеткавая арганізацыйная структура, у якую залучаюцца яе ўдзельнікі: са шматлікімі групамі, зачастую без відавочнага лідара, дзейснасць якіх перадусім палягае ў выкарыстанні роевых атак, раптоўнага збірання базава апрычоных індывідаў для выканання калектыўных дзеянняў дыверсійнага ці тэрарыстычнага кшталту. Паўставанне падобнага тыпу войнаў звязваецца аўтарамі з наступствамі інфармацыйнай рэвалюцыі, якая змяніла паводзіны і мэты ўдзельнікаў канфліктаў і завязала іх на катэгорыях інфармацыі і камунікацыі. «Больш чымсьці калісь, канфлікты адбываюцца вакол "веды" і выкарыстання "мяккай сілы"»[11]. Супраціўнікі вучацца выкарыстоўваць «інфармацыйныя аперацыі» і «менеджмент успрымання» («perception management»), то-бок медыяарыентаваныя сродкі, каб не знішчаць, але схіляць да сябе ці дэзарыентаваць, і каб уплываць на тое, наколькі бяспечна сябе пачувае грамадства, войска ці пэўныя колы і групы, нешта ведаючы пра сябе і

9 B. Szunyogh: *Psychological warfare; an introduction to ideological propaganda and the techniques of psychological warfare,* United States: William-Frederick Press 1955, 13.

10 *Networks and netwars : The Future of Terror, Crime, and Militancy*, Ed. by J. Arquilla, D. Ronfeldt. RAND Corporation, Santa Monica 2001, 6.

11 Ibid., 1-2.

сваіх супернікаў, – гэта ставіць за мэту перадусім псіхалагічнае руйнаванне, а не наўпрост фізічнае. Відавочна, што такая вайна можа весціся як на дзяржаўным, гэтак і на «прыватным» узроўні, бо сеткавыя структуры могуць захоўваць як сваю самастойнасць, гэтак і быць наймітамі нейкай іншай групы, карпарацыі ці дзяржавы.

Гэтыя ж даследчыкі часта выкарыстоўваюць і іншае паняцце «кібервайна»[12], якое з'явілася крыху раней і мае цяпер больш вузкае значэнне. Зараз пад гэтым словам пераважна маюць на ўвазе «дзеянні нацыянальнай дзяржавы па пранікненні ў іншыя нацыянальныя камп'ютары і сеткі дзеля мэт прычынення шкоды альбо разбурэння»[13]. Хаця дадзенае вызначэнне таксама з'яўляецца адносным, бо, апроч дзяржаўных агентаў, распачынаць падобныя дзеянні могуць розныя карпарацыі, экстрэмісцкія групоўкі, незалежныя хакеры, што дае іншыя найменні для згаданай з'явы – хактывізм, кібертэрарызм, сайбатаж (cybotage), інтэрнэт-войны. Агулам маецца на ўвазе перадусім сукупнасць дзеянняў, скіраваных супраць электронных сетак камунікацый і баз дадзеных, дзеля знішчэння інфармацыйнай структуры супраціўнікаў, здабыцця і магчымага агучвання патаемнай інфармацыі, а таксама дэмаралізацыі апанентаў за кошт пашкоджання каналаў сувязі, камунікатыўных і вылічальных цэнтраў.

Не менш пашыраным з гэтай нагоды робіцца іншы панятак – «інфармацыйная вайна» (infowar), альбо стратэгічныя інфармацыйныя аперацыі[14]. Звычайна пад гэтым словам разумеюць выкарыстанне і кіраванне інфармацыйнымі і камунікатыўнымі тэхналогіямі дзеля дасягнення перавагі над супернікам, што можа мець на ўвазе збіранне і праверку тактычнай інфармацыі пра яго, распаўсюджванне прапаганды ці дэзінфармацыі ў мэтах дэмаралізацыі ці маніпулявання ворагам ці грамадскасцю, прыніжэнне якасці інфармацыі супраціўніка і прыпыненне магчымасцей для контрзбірання інфармацыі. Што, ізноў-такі, можа набліжаць выкарыстанне дадзенага паняцця да тэрміна «псіхалагічная вайна». З усіх згаданых тэрмінаў найбольш пашыраным за апошнімі часамі ў нашым рэгіёне застаецца хіба панятак інфармацыйнай вайны, які асабліва часта ўжываецца для характарыстыкі той актыўнай прапаганды ўласных і прыніжэння чужых каштоўнасцей, што адбываецца праз дапамогу медыйных, перадусім тэлевізійных сродкаў на прасторы былога СССР[15].

---

12 J. Arquilla, D. Ronfeldt: "Cyberwar Is Coming!" // *Comparative Strategy*, 2, 1993, Vol. 12, 141–165.

13 R. A. Clarke, R. K. Knake: *Cyber War: The Next Threat to National Security and What to Do About It*, New York, Harper Collins Publishers 2010, 7.

14 Гл., напрыклад: W. Schwartau: *Information Warfare: Chaos on the Electronic Superhighway,* New York: Thunder's Mouth Press, 1994.

15 Прыклад абмеркавання самога паняцця і звязанай з ім практыкі: *Конференция: информационная война против Литвы ведется по всем направлениям* // DELFI.lt. Информационно-аналитический портал. Рэжым доступу: http://ru.delfi.lt/news/live/konferenciya-informacionnaya-

Таксама цікавымі ў згаданым кантэксце з'яўляюцца разважанні некаторых заходніх ваенных экспертаў пра істотныя змяненні ў самой структуры вайсковых злучэнняў і аперацый. Паводле даклада Пола Фістэра і Ігара Плоніша[16], зараз мы назіраем пераход да новай мадэлі арганізацыі вайсковай дзейнасці, якую яны называюць «ведацэнтрычным узбраеннем» (Knowledge Centric Warfare) і ўважаюць за лагічны працяг і эвалюцыю папярэдніх форм арганізацыі: платформавых структур, сеткацэнтрычных і інфармацыяцэнтрычных мадэляў. Калі першыя формы арганізацыі грунтаваліся на масавым ужыванні вайсковай сілы і прамым фізічным канфлікце, дык ужо наступныя формы абапіраліся на больш рафінаваныя формы арганізацыі вайсковай справы. Сеткавыя структуры дазволілі паменшыць памеры вайсковых злучэнняў іператварыць іх у скаардынаваныя і збалансаваныя баявыя адзінкі; інфармацыйныя структуры, у сваю чаргу, перанеслі асноўны акцэнт у вайсковых дзеяннях на працу штабоў, мысленчых цэнтраў вайны, якія на аснове ўсёй інфармацыі каардынавалі і планавалі дзейнасць усіх баявых адзінак, а эфектыўнасць вайсковага злучэння задавалася яго прыналежнасцю і кантролем за камунікацыйнымі сеткамі, размеркаваннем інфармацыі і здабыццём інфармацыйнай перавагі над супраціўнікам. Галоўнымі прыкметамі ж новага ведацэнтрычнага этапу развіцця вайсковых сістэм называецца: а) «выкарыстанне сетак» (не далучэнне да цэнтра інфармацыі, а аператыўны доступ да ўсёй інфармацыі ў Сеціве), б) «абарона ведаў» (прыхаванне ўласнай стратэгічна важнай інфармацыі) і в) «веданне сеткі» (тут веда мае большую значнасць над інфармацыяй, бо мала валодаць інфармацыяй, трэба ведаць, дзе якая інфармацыя размешчана і як яе можна выкарыстаць у належны момант)[17]. Эксперты нават прагназуюць хуткае выспяванне вайсковых сістэм новага пакалення, якія яны называюць разуменнецэнтрычным узбраеннем, бо натуральным крокам разважанняў з'яўляецца тое, што мала ведаць патрэбную інфармацыю, то-бок мець да яе выхад і кантроль, трэба будзе разумець тую веду – гэта значыць аператыўна змяняць спосабы інтэрпрэтацыі наяўнай веды ў рэчышчы канкрэтнай баявой сітуацыі. Высновай дадзенага даклада можна лічыць тое, што эпоха сучасных войнаў непазбежна змяніла сутнасць саміх вайсковых дзеянняў – барацьба змяшчаецца больш у бок кантролю за інфармацыйнымі плынямі і рэсурсамі веды, а не за непасрэдны фізічны кантроль і дамінаванне, што было стратэгіяй войнаў мінулых стагоддзяў. Адсюль у агульнай структуры вайсковых змаганняў сучаснасці паўстае ўзрастанне складніку сеткавых, інфармацыйных, ведавых і ў перс-

vojna-protiv-litvy-vedetsya-po-vsem-napravleniyam.d?id=61787605. Дата доступу: 20.10.2016.

16 P. W. Phister Jr., I. G. Plonisch: *Information and Knowledge Centric Warfare: The Next Steps in the Evolution of Warfare. Report* // Air Force Research Laboratory, Information Directorate 2004. Рэжым доступу: http://www.dtic.mil/cgi-bin/GetTRDoc?Location=U2&doc=GetTRDoc.pdf&AD=ADA465942. Дата доступу: 20.10.2016.

17 Ibid., 9.

пектыве герменеўтычных войнаў, што комплексна азначаецца паняццем «скрайняя сіла» («Power of the Edge»).

Гэта, між іншым, дае магчымасць перавытлумачыць яшчэ адно папулярнае паняцце, што да рэалій войнаў у нашым рэгіёне, – «гібрыдная вайна». Назва не зусім дакладная тым, што сцвярджае існаванне нібыта нейкай мутацыі гэтай формы вайны ў параўнанні з яе «нармальнай» (канвенцыйнай) формай, у той час як гэта комплексная ваенная стратэгія сучаснасці, якая абапіраецца на шырокае выкарыстанне менавіта элементаў інфармацыйных, сеткавых і псіхалагічных войнаў, ці, паводле вызначэння, на ўжыванне «разнастайных і дынамічных камбінацый канвенцыйных, нерэгулярных, тэрарыстычных і крымінальных спосабаў дзеяння»[18]. Асноўнымі атрыбутамі гібрыдных войнаў лічаць менавіта шырокае выкарыстанне сучасных відаў узбраення (у тым ліку кібератакі), масмедыйнай прапаганды, уплыў не толькі на канкрэтную арэну баявых дзеянняў, а на міжнародныя стасункі, камбінацыю традыцыйных баявых дзеянняў і груп з цяжка распазнавальнымі відамі нападаў і супрацоўнікамі без відавочнай ідэнтыфікацыі – тэрарыстычныя групы ці тэрарысты-самотнікі, хакеры, наёмніцкія згуртаванні, «народныя» апалчэнні (што часам нагадвае «карсарскія войны» эпохі трансатлантычных каланіяльных імперый, калі змаганне паміж вялікімі марскімі дзяржавамі адбывалася рукамі вонкава незалежных наймітаў з «ліцэнзіяй» на забойства супрацоўнікаў у абыход міждзяржаўных пагадненняў). Для нас, аднак, больш значным пытаннем з'яўляецца тое, якія складнікі падобнага тыпу вайны прыводзяць да комплекснага змагання за розумы і свядомасць людзей, пра што і пойдзе гаворка пазней.

Калі звярнуцца да прасторы абмеркаванняў расійскіх аналітыкаў і экспертаў[19], можна пабачыць выкарыстанне часткі вышэй згаданых паняццяў у пераасэнсаваным выглядзе, а таксама далучэнне некаторых іншых. Пры гэтым трэба адзначыць, што значным адрозненнем пазіцыі расійскіх экспертаў ад заходніх, якія пераважна спрабуюць грунтавацца на факталагічным аналізе, з'яўляецца перадусім апора на недасканалую ў навуковым плане тэорыю геапалітыкі, іншыя канспіралагічныя тэорыі, а таксама збольшага патрыятычна-ахоўны дыскурс іх аналітычных

---

18 B. P. Fleming: *The Hybrid Threat Concept: Contemporary War, Military Planning and the Advent of Unrestricted Operational Art*, Fort Leavenworth, KS: U.S. Army School of Advanced Military Studies (SAMS), U.S. Army Command & General Staff College, 2011 // Ike Skelton Combined Arms Research Library (CARL) Digital Library. Рэжым доступу: http://cgsc.contentdm.oclc.org/cdm/singleitem/collection/p4013coll3/id/2752/rec/1. Дата доступу: 20.10.2016.

19 Хаця большая частка расійскай палітычнай і ваеннай аналітыкі выконвае таксама, а часам і пераважна ідэалагічную функцыю, мы спынімся на нейтральным вызначэнні яе як аналітыкі і экспертызы, нягледзячы на частую ненавуковасць метадаў і спосабаў аргументацыі яе аўтараў.

выказванняў і прапазіцый[20]. Расія ўяўляецца верагоднай ахвярай зламысных дзеянняў з боку гегемона новага сусветнага парадку, які ці тое зводзіцца да канкрэтна дзяржавы ЗША, ці тое разглядаецца як ліберальная еўраатлантычная імперыя, і таму асноўнай праблемай застаецца пошук адэкватных сродкаў супрацьстаяння цывілізацыйнаму, ментальнаму, палітычнаму і іншым ціскам, якія пагражаюць цэласнасці і культурнай ідэнтычнасці расійскага народа. Асноўным правадніком тактыкі вядзення паліттэхналагічнай вайны супраць Расіі гэтыя эксперты збольшага лічаць практыку «каляровых рэвалюцый», канцэптуальна апісаную амерыканскім тэарэтыкам і грамадскім дзеячам Джынам Шарпам[21]. Зараз не надта істотна, наколькі падобная пазіцыя знаходзіць сваё пацвярджэнне ў рэчаіснасці альбо існуе адно ва ўяўленні расійскіх і прарасійскіх аналітыкаў і палітыкаў, але больш важным ёсць тое, што сучасны расійскі палітыкум праз уздзеянне падобных экспертных колаў і груп ужо мае падобныя ўстаноўкі ў якасці свайго пераважнага светапогляду і збольшага спрабуе выкарыстоўваць «адэкватныя» меры супрацьстаяння ў зоне сваіх інтарэсаў, адмыслова адлюстроўваючы такія тэхнікі нябачнай вайны, якія прыпісваюцца верагоднаму супраціўніку. Да таго ж некаторыя з гэтых тактык адпаведна ўгрунтаваныя ў палітычную і гістарычную традыцыю Расійскай імперыі і СССР.

Як ужо даводзілася, расійскія аналітыкі адначасова і ўдакладняюць выкарыстанне ўжо прынятых паняццяў, і прапануюць новыя. Прыкладам, удакладняецца змест паняцця інфармацыйнай вайны: «гэта кантэнтныя войны, што маюць за мэту змяненне масавай, групавой і індывідуальнай свядомасці. У працэсе інфармацыйных войнаў барацьба ідзе за розумы, каштоўнасці, устаноўкі, патэрны паводзінаў і г.д.», у той час як кібервойны – «гэта мэтанакіраванае дэструктыўнае ўздзеянне інфармацыйных плыняў у выглядзе праграмных кодаў на матэрыяльныя аб'екты і іх сістэмы»[22]. Альбо даецца таксама вызначэнне мэты інфармацыйна-сеткавай вайны:

---

20 Вельмі грунтоўны агляд пазіцый расійскай аналітыкі ў гэтым пытанні зроблены: Г. Почепцов. *Информационная война-2013 в представлениях российских экспертов* // Psyfactor.org. Информационный ресурсный центр по научной и практической психологии. Рэжым доступу: http://psyfactor.org/psyops/infowar24.htm. Дата доступу: 20.10.2016. Справядлівасці дзеля, варта адзначыць, што падобны кшталт аргументацыі і спасылкі на геапалітычныя канцэпцыі і цывілізацыйную тэорыю С. Гантынгтана дазваляюць сабе не толькі расійскія, але і шмат якія постсавецкія аўтары, у тым ліку і ўкраінскія, змяняючы адно рыторыку і вектар змагання: гл., прыкладам: И. Рущенко: *IV Мировая или первая гибридная межцивилизационная война?* // Информационное Сопротивление. Рэжым доступу: http://sprotyv.info/ru/news/kiev/iv-mirovaya-ili-pervaya-gibridnaya-mezhcivilizacionnaya-voyna. Дата доступу: 20.10.2016.

21 Дж. Шарп: *От диктатуры к демократии*, М.: Новое издательство 2005.

22 Е. Ларина, В. Овчинский: *Цифровые войны XXI века. Экспертный доклад* // Изборский клуб – Институт динамического консерватизма.

«Мэтай інфармацыйна-сеткавай вайны з'яўляецца трывалае замацаванне большай часткі стратэгічна важных рэсурсаў краіны-праціўніка за геапалітычным агрэсарам. Пры гэтым "перадача" гэтых рэсурсаў агрэсару ажыццяўляецца элітай краіны-ахвяры ў значнай ступені добраахвотна, паколькі ўспрымаецца ёю не як захоп, а як шлях да ўзыходзячага развіцця. Гэта спараджае складанасць у распазнанні тэхналогіі і метадаў інфармацыйна-сеткавай вайны ў параўнанні з традыцыйнай вайной, а таксама адсутнасць своечасовай рэакцыі на дзеянні агрэсара, паколькі ў ахвяры не аказваецца аніякіх мер супраціву»[23].

Адносна новым паняццем тут з'яўляецца «ананімная вайна», пад якой маецца на ўвазе тактыка непрамога ўздзеяння на дзяржаву-супраціўніка з выкарыстаннем сучасных тэхналогій «каляровых рэвалюцый» і ананімных груп – праваднікоў інтарэсаў замежных дзяржаў-агентаў, звычайна ў абліччы «пратэстных рухаў», якія пераводзяць фармат змагання з адкрытай інтэрвенцыі ў грамадскі бунт ці грамадзянскую вайну ў межах дзяржавы – аб'екта вядзення ваенных дзеянняў[24]. Асноўныя прыкметы такой вайны, на думку аўтараў: адсутнасць іерархій, выкарыстанне сацыяльных сетак, беспрацоўныя і сярэдні клас як сацыяльная база, інтэлектуалы-ідэолагі як «харунжыя» рэвалюцый, выразная семантыка, супрацьстаянне рэпрэсіям і патрабаванне эмансіпацыі – што агулам падпадае пад вызначэнне інфармацыйных баявых дзеянняў (information warfare). Відавочна, большая частка гэтых рысаў паходзіць з назіранняў над адпаведнымі працэсамі на постсавецкай прасторы і падзеямі «арабскай вясны», якія разглядаюцца расійскімі экспертамі як вынікі ўздзеяння амерыканскіх тэхналогій непрамых вайсковых дзеянняў, але не менш цікава, што, неістотна змяняючы некаторыя рысы, падобную матрыцу ўспрымання можна накласці і на тое, якім чынам паўставалі праекты «ДНР» і «ЛНР» на ўсходзе Украіны, якія свядома інспіраваліся пад відавочным расійскім пратэктаратам.

Яшчэ адным шырока скарыстаным паняццем падобнага ж зместу ў асяроддзі расійскіх экспертаў лічыцца тэрмін «арганізацыйныя аперацыі» і звязаны з ім «арганізацыйная зброя». «Ужыванне ***арганізацыйнай зброі*** адлюстроўвае гістарычную тэндэнцыю пераходу ад войнаў са знішчэннем суперніка да войнаў, арыентаваных на

Экспертный сайт. Рэжым доступу: http://www.izborsk-club.ru/content/articles/2320/. Дата доступу: 20.10.2016.

23 В.В. Карякин: *Мир вступил в эпоху войн седьмого поколения — информационно-сетевых войн* // Информационные войны. Научно-практический междисциплинарный журнал, 3 (19), 2011, 3. Рэжым доступу: http://media.wix.com/ugd/ec9cc2_dbb37c7f9d80a6ae91b369722bedf8c1.pdf. Дата доступу: 20.10.2016.

24 К. Черемных, М. Восканян: *АНОНИМНАЯ ВОЙНА. «Новый 1968 год»: мировоззренческое содержание и механизмы революций 2.0 (доклад Изборскому клубу)* // Изборский клуб – Институт динамического консерватизма. Экспертный сайт. Рэжым доступу: http://www.izborsk-club.ru/content/articles/1468/#1. Дата доступу: 20.10.2016.

яго ***самадэзарганізацыю*** і ***самадэзарыентацыю*** для захавання наяўнай рэсурснай базы ў інтарэсах ініцыятара прымянення зброі. На практыцы гэта ажыццяўляецца ўжываннем *сістэмы арганізацыйных (узгодненых па мэтах, месцы і часе разведвальных, прапагандысцкіх, псіхалагічных, інфармацыйных і інш.) уздзеянняў на супраціўніка, якія прымушаюць яго рухацца ў неабходным для процілеглага боку кірунку*[25]». У якасці найбольш спраўных механізмаў арганізацыйнай зброі разглядаюцца апазіцыйныя палітыкі, грамадскія актывісты, дзеячы культуры і навукі, якія працуюць на замежныя гранты ці супрацоўнічаюць з замежнымі фондамі і арганізацыямі. Эфектамі ўздзеяння арганізацыйнай зброі ў неабвешчанай вайне супраць Расіі могуць называцца разбурэнне гістарычных, ідэалагічных і культурных кодаў дзяржавы, дэманізацыя палітыкуму, сціранне гістарычнай памяці і здабыццё замест таго навязаных вобразаў чужой культуры і палітыкі і г.д. Такім чынам, патэнцыял інфармацыйных і сеткавых войнаў XXI ст. збольшага ацэньваецца расійскімі экспертамі ў кантэксце паліттэхналагічных і канспіралагічных схем, скіраваных супраць бяспекі дзяржаў, што спрабуюць сфармаваць альтэрнатыўныя цэнтры сілы ў дачыненні да гегемоніі аднаго сусветнага цэнтру. І самым распаўсюджаным адказам на неабходныя меры супрацьдзеяння падобным войнам, якія тыя эксперты агучваюць, з'яўляецца перайманне іх асноўных прынцыпаў і арганізацыйных формаў.

Цяпер, пасля таго, як мы зрабілі кароткі агляд асноўных паняццяў, якія выкарыстоўваюцца для вызначэння «нефізічных» войнаў сучаснасці, можна паспрабаваць акрэсліць ужыванне тэрміна «кансцыентальная вайна», які, з аднаго боку, утрымлівае ў сабе паасобныя складнікі згаданых вышэй тыпаў войнаў, з іншага ж – успрымаецца за пэўны комплексны варыянт ажыццяўлення інфармацыйна-псіхалагічнай вайны. Само паняцце «кансцыентальная вайна» (ад лац. conscientia – свядомасць, сумленне) было прапанаванае расійскімі даследчыкамі Ю. Грамыкам і Ю. Крупновым яшчэ ў 1996 г.[26], хаця пазней аўтары трохі разышліся ў яго разуменні і наогул сам тэрмін пачаў шырока выкарыстоўвацца ў расійскім паліталагічным экспертным полі ў межах патрыятычна-ахоўнага дыскурсу. Расійскі псіхолаг і метадолаг Ю. Грамыка так вызначае гэты тып войнаў: «Гэта войны, якія разгортваюцца перадусім са свядомасцю, можна было б сказаць – у свядомасці», закранаючы масу феноменаў кіравання грамадскай свядомасцю, «іх прадметам з'яўляецца ідэнтычнасць, то-бок тое, як сучасны ча-

---

[25] И.Ю. Сундиев, В.С. Овчинский: *Организационное оружие: Функциональный генезис и система технологий XXI века (доклад Изборскому клубу)* // Изборский клуб – Институт динамического консерватизма. Экспертный сайт. Рэжым доступу: http://www.izborsk-club.ru/content/articles/1466/#1. Дата доступу: 20.10.2016.

[26] *Кому будет принадлежать консциентальное оружие в XXI веке?* РОССИЯ-2010. Альманах межрегиональной государственности, М. 1997.

лавек сябе ідэнтыфікуе»[27]. У вызначэнні Ю. Крупнова «кансцыентальная вайна – вайна на паражэнне свядомасці. У аснове такога паражэння ляжыць знішчэнне ядзернай чалавечай здольнасці да свабоднай ідэнтыфікацыі, г.зн. да самавызначэння таго, кім чалавек імкнецца быць і ў рамках якой культурна-гістарычнай традыцыі»[28]. Гэта, на думку даследчыка, барацьба за самае дарагое, што ёсць у чалавека, – здольнасць быць адкрытым свету, але з іншага боку – аддаваць перавагу ўсведамленню ўласнага паклікання і сувязі з традыцыяй, іншымі людзьмі. Знішчэнне падобнай здольнасці прыводзіць да эфекту маніпулявання ідэнтычнасцямі і вонкавага навязвання розных спосабаў ідэнтыфікацыі, змянення сімвалічных ланцужкоў і рэжыму працы калектыўнага ўяўлення. Галоўны эфект ад уздзеяння кансцыентальнай зброі, згодна з аналітыкам, гэта абсалютна відавочнае і тройчы пэўнае перажыванне найвышэйшага росквіту міру і бясконцай далёкасці вайны ў насельніцтва, а таксама «прафесіяналаў» палітыкі і ваеннай справы ў той час, калі супраць нейкай дзяржавы альбо нацыянальнай супольнасці вядуцца незаўважаныя вайсковыя дзеянні. Беларускі вайсковы журналіст і аналітык Уладзімір Макараў удакладняе гэтае разуменне і піша, што «пад кансцыентальнай вайной, альбо вайной у сферы сэнсаў, трэба разумець вайну псіхалагічную паводле формы, цывілізацыйную паводле зместу і інфармацыйную паводле сродкаў, у якой аб'ектам паражэння з'яўляецца свядомасць людзей, з мэтай знішчэння ці дэфармацыі інтэлектуальнага рэсурсу нацыі і разбурэння ўніверсальных установак насельніцтва»[29], сваім вызначэннем злучаючы паняцце кансцыентальнай вайны з іншымі да яго падобнымі. Такім чынам, калі падсумаваць, можна сказаць, што кансцыентальная вайна мае на ўвазе пераважную барацьбу за змяненне пластоў свядомасці чалавека, звязаных з паняццямі ідэнтычнасці, прыналежнасці да традыцыі, культуры.

Паводле разважання Ю. Грамыкі, непасрэднымі фактарамі для магчымасці паўставання падобнага кшталту войнаў у сучаснасці могуць лічыцца наступныя глабальныя змены ў разуменні самой вайсковай справы і архітэктуры ваенна-прамысловага і палітыка-эканамічнага комплексаў. Па-першае, са спасылкай на працы А. Тофлера[30], хаця падобнага кшталту рэфлексіі можна знайсці і ў

---

[27] Ю. Громыко: *Консциентальное оружие и консциентальные войны* // Центр гуманитарных технологий. 25.02.2007. Рэжым доступу: http://gtmarket.ru/laboratory/publicdoc/2007/782. Дата доступу: 20.10.2016.

[28] Ю. Крупнов: *Как Россия сможет предотвратить пятую мировую войну* // Персональный сайт Ю. Крупнова, 9.02.2005. Рэжым доступу: http://kroupnov.ru/pubs/2005/02/09/10403/#1-14. Дата доступу: 20.10.2016.

[29] В. Макаров: Война в сфере смыслов // *Реферативный журнал социокультурного и политического анализа* (Тема выпуска: Постмодерн), 1, 2011. Рэжым доступу: http://sovschola.ru/content/rzhskpa-vyp-1-postmodern. Дата доступу: 20.10.2016.

[30] Э. Тоффлер, Х. Тоффлер: *Война и антивойна. Что такое война и как с ней бороться. Как выжить на рассвете XXI века,* М.: Аст: Транзит-

ранейшых працах Ж. Бадрыяра[31], азначаны глабальны трэнд па замяшчэнні стандартнага ВПК у галіне планавання і вядзення вайсковых дзеянняў на масмедыйны (якi грунтуецца на СМІ) і інвайранментальны (звязаны з праблемамі навакольнага асяроддзя) ваенна-прамысловы комплекс. Гэта значыць, што «карцінка» вайсковых дзеянняў на сёння робіцца найбольш значным элементам саміх гэтых дзеянняў: эмацыйныя рэакцыі, абмеркаванні і грамадская думка наконт вайсковых дзеянняў – натуральная частка правядзення саміх аперацый, адмыслова запланаваная ад самага пачатку, таму сучасная вайна збольшага «тэлевізійная», альбо «медыйная». Па-другое, ужо са спасылкай на нямецкага тэарэтыка Фрыдрыха Фрайгера фон дэр Гайтэ[32], згадваецца тэндэнцыя на замяшчэнне глабальных вайсковых дзеянняў, асабліва з выкарыстаннем ядзернай зброі, на тактыку «малых войнаў», што адбываюцца на абмежаваных тэрыторыях і залучаюць абмежаваныя групы насельніцтва, але не маюць аніякіх абмежаванняў на тыпы і інтэнсіўнасць гвалту падчас правядзення вайсковых аперацый, што расхіствае ўсе міжнародныя пагадненні ў дадзенай галіне і галоўнае – мае вялікі прапагандысцкі эфект у выпадку іх дэманстрацыі і абмеркавання. Гэта практыка тэрору і дэмаралізацыі значнай часткі насельніцтва краін, уцягнутых у падобныя канфлікты, ламання традыцыйных каштоўнасцей і прыярытэтаў грамадства. Тактыка, спачатку адпрацаваная на афрыканскім і азіяцкім кантынентах, а цяпер шырока выкарыстаная ў тым ліку і на постсавецкай прасторы: такімі «малымі войнамі» можна лічыць і першыя дзве Чачэнскія кампаніі ў Расіі, і Прыднястроўскі, Нагорна-Карабахскі, Паўднёва-Асецінскі канфлікты, а таксама тое, што цяпер адбываецца на ўсходзе Украіны. Гэта мае на ўвазе, што вайна можа быць вельмі кампактнай паводле маштабу дзеянняў, але праз медыяпрастору мець вялікі псіхалагічны ўплыў на ўсе ўцягнутыя бакі.

Па-трэцяе, гэта паступовае выцясненне нацыянальнай дзяржавы структурамі дзяржавы сеткавай, са спасылкамі на працы раней цытаванага Дж. Аркіла, дзе сама дзяржава пачынае выглядаць як складаная камунікацыйная сетка з недакладна вызначанымі цэнтрам і перыферыяй і экспансія якой звязана не з тэрытарыяльнымі захопамі, а з перацягваннем і пераідэнтыфікацыяй насельніцтва пэўных рэгіёнаў на свой бок праз залучэнне іх у свае інфармацыйна-сеткавыя каналы. Гэта тое, што звычайна цяпер на постсавецкай прасторы прынята звязваць з паняццем інфармацыйнай вайны і апрацоўкі свядомасці жыхароў памежных рэгіёнаў з дапамогай медыясродкаў і наўпроставай прапаганды, і так, найверагодней, у наш час працуе, напрыклад, ідэалогія «рускага свету». Нарэшце, апошнім фактарам прызнаецца існаванне малых аўта-

---

книга 2005.

[31] J. Baudrillard. *The Gulf War did not take place* / Transl., introd. by Paul Patton, Bloomington & Indianapolis: Indiana university press 1995.

[32] Friedrich August Heydte (Freiherr von der): *Der moderne Kleinkrieg als wehrpolitisches und militärisches Phänomen,* Holzner, Würzburg 1972.

номных груп дзеяння, як рэшткаў сістэмы сусветнага супрацьстаяння часоў «халоднай вайны», што абапіраецца на геапалітычную па духу тэорыю астэроідных груп нямецкага палітолага Міхаэля Лібіга. Дзеянні падобных груп цяжка прадказаць, паколькі яны існуюць паводле аўтаномных праграм, рэалізуючы стратэгіі ранейшага часу і мабілізуючы разгорнутыя і гнуткія сеткі рэалізацыі сваіх аперацый: гэта могуць быць заканспіраваныя дыверсійна-разведвальныя групы (ДРГ), тэрарыстычныя арганізацыі, шпіёнскія сеткі. Як можна пабачыць, усе згаданыя трэнды добра ўпісальныя ў схемы гэтак званай гібрыднай, альбо комплекснай, вайны, дзе інфармацыйнаму і псіхалагічнаму складніку аддаецца перавага перад наўпроставым вайсковым супрацьстаяннем.

Калі казаць пра сутнасць кансцыентальных войнаў, дык, паводле вызначэння Ю. Грамыкі, асноўным прадметам іх уздзеяння з'яўляецца ідэнтычнасць чалавека, альбо «працэс самавызначэння дадзенага чалавека ў дачыненні да традыцыі і культуры», што мае на ўвазе і канфесійны складнік, і моўнае пытанне, і базавыя цывілізацыйныя каштоўнасці[33]. Асноўнай тэзай згаданага падыходу з'яўляецца сцвярджэнне аб магчымасці штучнай змены або гвалтоўнай трансфармацыі падобных структур ідэнтычнасці пад уздзеяннем сродкаў масмедыя, Інтэрнэту, пад уплывам спецыяльных праграм перафарматавання асобы – стварэння гнуткай, альбо плыткай, пераключальнай («хайфенізаванай», ад англ. Hyphen – знак аддзялення, дэфіс) ідэнтычнасці. Апошняе з'яўляецца прыкметай перафарматавання свядомасці пад уплывам постмадэрнісцкіх філасофскіх практык, лічыць аўтар, ды, бадай, не ён адзіны, бо, прыкладам, вядомы ідэолаг расійскага імперскага традыцыяналізму і неакансерватызму А. Дугін наогул праводзіць думку пра канцэптуальнае адставанне ў асяроддзі расійскага палітыкуму і экспертаў, якія не здатныя зразумець і супрацьстаяць заходняй сеткавай зброі, што грунтуецца на прынцыпах постмадэрнізму[34]. Варта адзначыць, што постмадэрнізм як філасофская ідэалогія наогул уяўляецца шмат каму з расійскіх экспертаў як галоўная пагроза традыцыйным каштоўнасцям і нацыянальнай расійскай ідэнтычнасці і культуры, то-бок як інфармацыйнае або арганізацыйнае ўзбраенне ліберальнага свету.

Змена свядомасці альбо пасоўванне ідэнтычнасці праз постмадэрнісцкія тэхналогіі разглядаюцца ў такім разе як адмысловая крытыка «непажаданых» форм ідэнтычнасці (якія называюцца «гамафобнымі», «патрыярхальнымі» і г.д.) і свядомае культываванне іншых, варожых традыцыйным узорам нацыянальнай ідэнтычнасці

---

33 Громыко, указ. соч.

34 А. Дугин, В. Коровин, А. Бовдунов: *Сетевые войны. Аналитический доклад* // Изборский клуб – Институт динамического консерватизма. Экспертный сайт. Рэжым доступу: http://www.izborsk-club.ru/content/articles/2318/. Дата доступу: 20.10.2016. Таксама падобныя думкі можна сустрэць у іншага вядомага расійскага ідэолага С. Кургіняна, які разглядае гэта як новую тактыку вайны-гульні супраць СССР і Расіі на глебе заходніх гуманітарных тэхналогій.

каштоўнасных схем (кшталту феміністкіх, неаліберальных). Гэта магчыма за кошт ад пачатку разгойданага стану ідэнтычнасці сучаснага чалавека[35], што з'яўляецца наўмысна арганізаванай сацыяльнай практыкай насуперак трывалым характарыстыкам ідэнтычнасці традыцыйных грамадстваў. Па сутнасці, гаворка ідзе пра тыя кагнітыўныя схемы, з дапамогай якіх адбываецца першасная інтэрпрэтацыя падзей рэальнасці, бо стаўленне чалавека да таго ці іншага факта вызначаецца наборам яго каштоўнасцей, перадразваг, ідэй, і таму наўмыснае «паслабленне», альбо, як кажа італьянскі філосаф і палітык Джані Ваціма, «дэбалізацыя» свядомасці сучасных еўрапейцаў – гэта цалкам натуральны крок у межах паглыблення палітыкі мультыкультуралізму і талеранцыі, прыняцця чужых каштоўнасцей і ладаў жыцця. З тае прычыны, што падобная палітыка пад уздзеяннем працэсаў глабалізацыі робіцца дзейсным фактарам інфармацыйнага поля ўсходнеславянскіх краін таксама, рэакцыя расійскіх экспертаў цалкам укладаецца ў азначэнне патрыятычна-абарончай пазіцыі. Перайманне «паслабленай» ідэнтычнасці ўспрымаецца тады як пагроза традыцыйным расійскім каштоўнасцям і непрамое панаванне над розумамі, што можа весці да паглынання ці істотнага паслаблення моцы расійскай дзяржавы «ліберальнай імперыяй Захаду».

Сродкам супрацьстаяння падобнай пагрозе згаданы Ю. Грамыка лічыць практыку аўтэнтызацыі, то-бок устойлівага захавання прыналежнасці да пэўнай культуры і яе кодаў, ахоўнага механізму захавання трывалай ідэнтычнасці: і чым старэйшая і глыбейшая тая культура, тым гэтая практыка рэзістансу больш паспяховая. Таму лагічным разгортваннем падобнага кшталту развжанняў наконт спосабаў ажыццяўлення кансцыентальнай вайны робяцца сцвярджэнні яшчэ аднаго расійскага аналітыка Наталлі Комлевай пра дзве асноўныя формы вядзення – «археалагічную вайну» з «перапісваннем гісторыі» і «перапісванне скрыжаляў»[36]. Пад першым азначэннем яна мае на ўвазе ўсе выпадкі масавага знішчэння археалагічных помнікаў старажытных індаеўрапейскіх цывілізацый Усходу (хрысціянскіх, мусульманскіх, будыйскіх, зараастрыйскіх і іншых сакральных будынкаў, разрабаванне музеяў і г.д.), што ініцыююцца,

[35] Гэта можна быць як нібыта «натуральны», гэтак і інспіраваны працэс. Апошні разглядаецца са спасылкай на паняцце С. Кургіняна «штучная шызафрэнізацыя свядомасці» і ўзгадкай пра досвед крызісу постсавецкай ідэнтычнасці, калі, прыкладам, хістанні між ідэямі савецкай планавай экономікай і ідэалогіяй свабоднага рынку ў свядомасці людзей (пераважна з вышэйшай адукацыяй) прыводзіла іх да супярэчлівага прыняцця ўдзелу ў разгортванні фінансавых пірамід кшталту МММ з адначасовым разуменнем абсурднасці эканамічнага абгрунтавання дадзеных форм атрымання прыбытку. Гл., напрыклад: В.М. Макаров *Консциентальная война: миф или реальность?* // Наука и военная безопасность, №2, 2003.

[36] Н.А. Комлева. *Консциентальная война: глобальные тренды глобального противоборства* // Пространство и Время, 3 (21), 2015. Рэжым доступу: http://cyberleninka.ru/article/n/konstsientalnaya-voyna-globalnye-trendy-globalnogo-protivoborstva. Дата доступу: 20.10.2016.

на думку аўтаркі, рознымі экстрэмісцкімі групоўкамі праз прамыя ўказанні адпаведных спецслужбаў Захаду і пад уплывам пан-ідэалогіі амерыканскага неаліберальнага імперыялізму, які імкнецца на руінах старых цывілізацый усталяваць новы сусветны парадак. Калі будуць вынішчаны матэрыяльныя помнікі мінулых культур, гістарычнай памяці не будзе да чаго прывязацца і таму гісторыю можна будзе ляпіць на які заўгодна манер. Пад другім аўтарка мае на ўвазе руйнаванне агульначалавечых маральных нормаў і запаветаў, а таксама дэсакралізацыю прарокаў і святых сімвалаў веры праз знішчальныя інструменты постмадэрнізму: ЛГБТ-практыкі, легітымацыю педафіліі і прастытуцыі, сурагатнае мацярынства, культуру чайлдфры, культ геданізму і спажывання і г.д. Перапісваючы гісторыю і культуру, лічыць аўтарка, заходняя цывілізацыя сцвярджае сваю пан-ідэю свабоды і правоў чалавека як ідэалагічную абалонку для наўпроставага палітычнага і сілавога дамінавання ў сучасным свеце насуперак іншым цывілізацыям і культурам. Цікавым у гэтым падыходзе з'яўляецца тое, што адпаведныя згаданыя практыкі гвалтоўнага змянення ідэнтычнасці ўжо даўно і шырока выкарыстоўваліся ў самой расійскай палітычнай культуры, пачынаючы яшчэ ад часоў Расійскай імперыі, калі расійская школа і царква разглядаліся як асноўныя спосабы ўсталявання расійскай палітычнай улады над каланізаванымі ёй народамі Усходняй Еўропы і Сярэдняй Азіі. Гэта і сапраўды суправаджалася вынішчэннем культурных помнікаў паняволеных этнасаў – руйнаваннем гарадскіх ратуш, палацаў, касцёлаў, мячэцяў, сінагог (асабліва ўжо за савецкімі часамі і з цалкам адмысловай ідэалогіяй), разрабаваннем мясцовых музеяў, бібліятэк, перапісваннем і падробкай хронік і летапісаў, замяшчэннем гістарычных канфесій на сваю нацыянальную (кшталту ганенняў на ўніяцкую грэка-каталіцкую царкву і гвалтоўны перавод прыхаджан у праваслаўе на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай) і г.д. Таму згаданыя практыкі не ўяўляюцца цалкам фантастычнымі і адлюстроўваюць хутчэй досвед расійскай імперскай гісторыі, перанесены з дапамогай канспіралагічных схем на ўяўленчы спосаб дзеяння варожай «імперыі Захаду». Урэшце, можна нават сцвярджаць, што кансцыентальная вайна ў падобным разуменні – гэта перадусім вайна каланіяльная, якая разгортваецца пры дапамозе сродкаў псіхалагічнага і інфармацыйнага ўздзеяння і асноўнай сваёй мэтай мае барацьбу за культурную ідэнтыфікацыю, нацыянальную і цывілізацыйную ідэнтычнасць. Тое, што расійскія аналітыкі адчуваюць сваю культурніцкую і дзяржаўную ідэнтычнасць пад пагрозай, тлумачыцца механізмамі пераносу на сябе адпаведных каланіяльных стратэгій з прыманнем сцвярджэння пра існаванне сусветнай мегаімперыі, якая праводзіць свой каланіяльны ўплыў цяпер і на старыя аслабелыя імперыі. Такі спосаб разумення рэчаіснасці схіляе іх да перанясення на сябе статусу магчымай рэсурснай калоніі – аб'екта чужых уздзеянняў, што спрычыняе выкарыстанне элементаў посткаланіяльнага дыскурсу і вядзе да распрацоўкі пра-

ектаў супрацьдзеяння чужому каланіяльнаму ўплыву праз інтэнсіфікацыю каланіялізму ўласнага, ужо ў «зоне расійскіх інтарэсаў».

Такім чынам, калі зрабіць папярэдняе падсумаванне, можна сцвярджаць, што на сёння існуе вялікая разнастайнасць формаў вядзення ваенных дзеянняў нефізічнага тыпу, якія атрымліваюць свае назвы праз падкрэсліванне таго ці іншага аспекту іх скіраванасці альбо спосабу ажыццяўлення: псіхалагічныя, сеткавыя, інфармацыйныя, кібернетычныя, гібрыдныя войны, сетка- і разуменнецэнтрычнае ўзбраенне найноўшай вайны, арганізацыйная зброя і, зрэшты, кансцыентальная вайна. Апошні тэрмін падаецца найбольш грунтоўным, паколькі дазваляе прааналізаваць ядравую структуру ўсіх падобных тыпаў вядзення «новых войнаў» сучаснасці: сістэматычнае ўздзеянне на структуры свядомасці і спосабы канструявання ідэнтычнасці чалавека. Падобная форма змагання натуральна можа спалучаць у сабе шэраг іншых фарматаў ваеннага супрацьстаяння – псіхалагічныя, інфармацыйныя, сеткавыя і іншыя, раней пералічаныя. У адрозненне ад больш разнастайнага феномена гібрыднай вайны, паняцце вайны кансцыентальнай робіць акцэнт менавіта на «ўнутраным», свядомасным складніку правядзення вайсковай кампаніі, абмінаючы фактары прамога гвалтоўнага ўздзеяння, нават у малых дозах, але спажываючы матэрыял гібрыднай вайны ў якасці ўласнага зместу. Базавае пытанне наконт ідэнтычнасці тут разглядаецца звычайна ў апазіцыі слабой і моцнай ідэнтычнасцей, прывязаных альбо да паслабленых ліберальных каштоўнасцей, альбо да каштоўнасцей традыцыйных, але, улічваючы агульную эрозію першых і другіх, гаворка можа ісці хутчэй пра высілкі па перафарматаванні базавых каштоўнасных механізмаў і спосабаў самаідэнтыфікацыі ў грамадствах, што робяцца ахвярамі кансцыентальнай вайны і яе прапаганды. Хаця большую частку аргументаў на карысць уяўленняў пра спосабы ажыццяўлення кансцыентальнай вайны расійскія аналітыкі і эксперты, якім належыць гэты тэрмін, бяруць зыходзячы з пэўных канспіралагічных і геапалітычных схем разважання і грунтуючыся на патрыятычна-ахоўных ідэалагічных пазіцыях (што пакідае пытанне наконт іх рэлевантнасці), істотна, што падобнае ўяўленне пра вайну можа рабіцца дзейсным сродкам для яе разумення і практыкавання на ўзроўні афіцыйнай расійскай ваеннай і інфармацыйнай палітыкі.

## 2.

У кансцыентальнай вайне гаворка, аднак, ідзе не пра ўсю нават сістэму каштоўнасцей і пераваг чалавека, а пра пэўныя ўстойлівыя патэрны ідэнтычнасці, якія дапамагаюць чалавеку разважаць і аналітычна ўпарадкаваць атрыманую інфармацыю для наступнага працэсу разважання. Істотным для пазіцыі Ю. Грамыкі пры вызначэнні эфектаў кансцыентальнай вайны з'яўляецца сцвярджэнне пра немагчымасць абапірання на самі факты альбо падзеі, якія адбываюцца ў інфармацыйнай прасторы, без наяўнасці ад-

мысловай праграмы ідэнтычнасці. Гаворка ідзе пра падобную ж выснову, да якой прыйшлі філосафы і метадолагі навукі XX ст.: сам па сабе «навуковы факт» нічога не кажа нам пра рэчаіснасць, бо свой змест ён атрымлівае адно ў межах навуковай тэорыі, якая гэты факт інтэрпрэтуе на ўласны манер і надае яму адпаведныя сэнсы[37]. Таму і проста назіраць падзею немагчыма, асабліва, калі нейкая падзея падаецца пры дапамозе сродкаў масмедыя. Каб атрымаць доступ да падзеі, трэба выкарыстаць інфармацыйную машыну, што адпаведным чынам тую падзею адфарматуе і падасць у належным ракурсе, і таму назіральнік мусіць верыць той «карцінцы», што яму прад'яўляе экран і якая выглядае нашмат больш пераканальна, чымся чыесь словы альбо сведчанні. Самі падзеі існуюць ужо ў сімвалічнай рэальнасці і таму могуць выкарыстоўвацца не толькі для мэтаў прасоўвання пэўнай інфармацыі, але і дзеля замацавання пэўных сімвалічных патэрнаў, як элемент сімвалічнай зброі. Пры гэтым успрыманне падзеі будзе відавочна залежыць ад таго, якую пазіцыю паводле ідэнтычнасці будзе займаць назіральнік, альбо які ягоны цэнтр ідэнтычнасці, а не ад таго, наколькі пераканальна выглядае сама медыяпадзея ці каментар да яе (праілюстраваць тое можна пры дапамозе вядомых медыясюжэтаў пра «ўкрыжаванага хлопчыка ў Славянску», «збіты малайзійскі Боінг» і «адэскую Хатынь» – трагедыю ў доме прафсаюзаў 2.05.2014, дзе назіраецца дыяметральна супрацьлеглае стаўленне да медыяпадзеі ў пераважнай частцы расійскай і ўкраінскай аўдыторыі СМІ[38]).

Тут мы падыходзім да аднаго з цэнтральных пытанняў нашага артыкула: чаму апарат кансцыентальнай вайны настолькі дзейсны, што закранае нават большую частку інтэлектуалаў, якія б мусілі захоўваць больш разважліва-аналітычную пазіцыю ў дачыненні да падзей, што разгортваюцца вакол іх? Першасны адказ можна знайсці ў згаданага Ю. Грамыкі, а больш падрабязнае вытлумачэнне даць пры дапамозе сучаснай тэорыі прапаганды Жака Элюля. Датычна спосабу ажыццяўлення кансцыентальнай вайны Грамыка сцвярджае, што, калі свядомасць чалавека мае справу з складанымі (медыя)падзеямі ёй цяжка ўтрымліваць свой натуральны механізм рэфлексіі: «У выпадку складанай падзеі, з нагоды якой трэба сабраць агромністы масіў фактаў – экспертных меркаванняў, аналізу наступстваў, – так выяўляецца, што пакласціся на сваю ўласную самасвядомасць не атрымаецца, патрэбная экранная тэхналогія, на якой усё гэта будзе мантавацца»[39]. Таму для ўсведамлення таго, што адбываецца, чалавеку робіцца патрэбны базавы давер да таго экрана, планшэта, на якім падзея збіраецца,

[37] Гл., напрыклад: Т. Кун: *Структура научных революций*. С вводной статьей и дополнениями 1969 г. М.: Прогресс, 1977. П. Фейерабенд: Против методологического принуждения // *Фейерабенд П. Избранные труды по методологии науки*. М. 1986.

[38] Тут і надалей будуць давацца прыклады пераважна расійскай ваеннай прапаганды як найбольш рэпрэзентатыўныя для рэгіёна.

[39] *Консциентальное оружие и консциентальные войны*. Лекция Юрия Громыко, там жа.

і далейшыя дзеянні і самавызначэнне будуць залежаць ад кшталту карцінкі, якая, зрэшты, будзе сабраная з дапамогай медыятэхналогій. Такім чынам, свядомасць робіцца «пашыранай», экраннай, і тым самым губляецца крытычнае стаўленне да паказанага на экране, бо інакш чалавек цалкам губляе здатнасць неяк даць рады той падзеі, што ён непасрэдна перажывае. Пры гэтым, лічыць Грамыка, і самі СМІ часта не могуць даць рады той падзеі, якую яны адлюстроўваюць, таму самі падпадаюць пад уласны эфект, хаця і лепш разумеюць яго тэхнічна, і падзяляюць свядомасць падзеі разам са сваімі глядачамі. Тое, што медыя-падзея – гэта не чыстае адлюстраванне рэчаіснасці, а яе мадыфікацыя – дастаткова старая тэза. Варта прыгадаць класічную працу Эдуарда Гэрмана и Ноама Чомскі «Палітэканомія масмедыя», дзе прадэманстравана, што, нават у адсутнасці наўпроставага ціску з боку цэнзуры ці дзяржаўнай улады, медыя змушаныя фабрыкаваць сваю карцінку пад уплывам шэрагу фактараў: а) арыентацыі на прыбытак і меркаванні ўладальнікаў/асноўных інвестараў; б) пераваг рэкламадаўцаў, якія прыносяць жывыя грошы ў СМІ; в) прыхільнасці да буйных вытворцаў навін, што працуюць на льготных умовах і выпрацоўваюць большасць кантэнту навін і інфармацыі; г) жадання пазбягаць масавага абстрэлу («Flak») з боку грамадскіх арганізацый, юрыстаў, кампаній і г.д., часта рэжысараванага з аднаго месца, пры закрананні пэўных тэмаў (што фактычна ўводзіць самацэнзуру); д) шчыраванне вядучага палітычнага трэнда (якім для амерыканскіх медыя доўгі час быў антыкамунізм, цяпер жа хутчэй «вайна з тэрорам»)[40]. Таму падзея ў медыя – гэта заўжды пэўным чынам паказаная версія падзеі, якая можа адлюстроўваць інспіраваны кімсьці альбо несвядома адфарматаваны палітыкай рэдакцыі інфармацыйны прадукт.

Пры падобным раскладзе свядомасць як быццам перастае належаць канкрэтнаму чалавеку і робіцца нібы паспалітым здабыткам – «пашыраецца», гэта першае; па-другое, ствараецца і сам «ландшафт» дзейнасці нашай свядомасці праз воблака аналітычных і экспертных ацэнак, версій падзей, якія, па сутнасці, маніпулююць гэтым «грамадскім», «пашыраным» цэлым свядомасці. Падобныя маніпуляцыі не зламысныя, але, на думку Ю. Грамыкі, прыродна непазбежныя: кожны суб'ект маніпулявання зацягваецца ў гэты працэс, бо мае свае інтарэсы і намер іх адстойваць, і ў працэсе праследу гэтых інтарэсаў мусіць кантраляваць разгортванне медыяпадзей. І ў гэтых абставінах для ўсіх удзельнікаў працэсу, зрэшты, «робіцца практычна немагчымым супрацьпаставіць тое, што паказваецца і ўсведамляецца, і рэальнасць»[41]: дэманстрацыя падзеі робіцца тоеснай самой падзеі і не можа быць адарваная ад апошняй. Чалавек больш не ў стане аддзяліць тое, што ў свядомасці, ад таго, што ёсць у сапраўднасці: паказаная падзея для яго рэпрэзен-

---

40 E. S. Herman, N. Chomsky: *Manufacturing Consent: The Political Economy of the Mass Media*, New York: Pantheon Books 1988.

41 *Консциентальное оружие и консциентальные войны.* Лекция Юрия Громыко, там жа.

татыўная настолькі, наколькі яна адпавядае ягоным перажыванням таго, як яно мае быць у сапраўднасці, то-бок экранная тэхналогія цалкам фармуе ўспрыманне рэчаіснасці. Як вядомая «кінахроніка» штурму Зімняга палаца запаўняла свядомасць савецкага гледача ў якасці адпаведнага адлюстравання рэчаіснасці, як падзея-факт, «так яно і было напраўдзе», ці ў сучасным кантэксце шырока распаўсюджаная практыка выдавання фотаздымкаў адных падзей за іншыя, прыкладам – вядомы фотаздымак смерці маленькага сірыйскага хлопчыка-бежанца на турэцкім узбярэжжы за фотафакт смерці бежанца ў водах мацерыковай Грэцыі. Канешне, гаворка можа ісці перадусім пра складаныя падзеі, у адносінах да якіх чалавек застаецца адно вонкавым назіральнікам і не прымае надта шчыльнага ўдзелу, напрыклад, у адрозненне ад спраў штодзённасці[42]. Гэта перадусім тлумачыць тое, як адбываецца паступовае замяшчэнне крытычнага стаўлення да медыяпадзеі на яе актыўную адаптацыю праз пашыранне экраннай свядомасці – чалавек нібыта перастае жыць уласным розумам і жыве ў калектыўным уяўленні. Тэма, дарэчы, вельмі падобная да таго, што развівае ў сваіх працах амерыканскі філосаф-постмарксіст Славой Жыжэк, які даводзіць, што пры дапамозе масмедыя і культуріндустрыі сёння адбываецца фармаванне

[42] Паводле апытання, праведзенага Левада-цэнтрам, вынікі якога былі апублікаваныя 12.08.2016, пераважная частка грамадзян Расійскай Федэрацыі (каля 86%) атрымлівае пераважную інфармацыю пра ўсе падзеі краіны і свету з тэлебачання і ўзровень агульнага даверу гэтаму каналу СМІ складае каля 59%. У той жа час звяртае на сябе ўвагу, што найбольш аб'ектыўнай рэспандэнты лічаць пададзеную інфармацыю пра падзеі вонкавай палітыкі (58%) і толькі 25-27% уважаюць за аб'ектыўную інфармацыю асвятленне падзей эканомікі, нутраной палітыкі і адлюстравання жыцця простых людзей па ТБ. Хаця ў параўнанні з 2009 г. узровень даверу крыху прыпаў, але безадносна таго застаецца даволі высокім і на сёння. Пры гэтым давер да словаў іншых людзей і ў тым ліку палітыкаў і лідараў грамадскай думкі у рэспандэнтаў не перавышае 39% і 14% адпаведна. Крыніца: Аналитический Центр Юрия Левады (АНО Левада-Центр). Рэжым доступу: http://www.levada.ru/2016/08/12/14111/. Дата доступу: 20.10.2016. Падобныя ж вынікі можна назіраць паводле апытанняў, праведзеных беларускага НІСЭПД у чэрвені 2014 г. Базава глядзяць беларускія і расійскія дзяржаўныя тэлеканалы для атрымання інфармацыі пра міжнародныя падзеі больш за 60% беларусаў, пры гэтым амаль 52% уважаюць падачу інфармацыі на расійскім ТБ за аб'ектыўную (табл.10 і 11) і адпаведна таму ацэньваюць падзеі ва Украіне пераважна паводле версій расійскіх медыя. Крыніца: Независимый институт социально-экономических и политических исследований. Рэжым доступу: http://www.iiseps.org/?p=1442. Дата доступу: 20.10.2016. У той жа час пераважны давер да дзяржаўных СМІ ў беларусаў, дзе сістэма медыйнай прапаганды склалася на постсавецкай прасторы досыць рана, застаецца традыцыйна высокім і дастаткова стабільным: 55% (да 70% у сельскіх раёнах) – у 2005 г., 47% – у снежні 2014 і 38% – у сакавіку 2015 г. Крыніца: Там жа. Рэжым доступу http://www.iiseps.org/?p=1824 і http://www.iiseps.org/?p=2680. Дата доступу: 20.10.2016.

калектыўных фантазмаў і пасоўванне ўспрымання рэальнасці ў бок уяўляльнага[43].

Нешта падобнае ва ўспрыманні сучаснай прапаганды мадэрным чалавекам апісвае і Жак Элюль, калі кажа, прыкладам, пра такую з'яву, як грамадская думка, што, на яго думку, з'яўляецца не інакш як інструментам прапагандыста, які распаўсюджваецца праз СМІ для спажывання масамі, паколькі па-за сеткамі масмедыйных камунікацый грамадская думка існаваць не ў стане, і аніякая маса людзей не зможа яе збудаваць апрычона. Індывіды схільныя замяшчаць сваю волю калектыўнай воляй вялікага суб'екта – такога як нацыя, народ, грамадзяне і г.д., а рэпрэзентацыя тае волі адбываецца менавіта праз СМІ, якія адлюстроўваюць сфабрыкаваны грамадскі кансэнсус праз адпаведныя медыявобразы. Пры гэтым і палітыкі, нават дэмакратычныя, таксама патрапляюць у пастку падобнага сфабрыкаванага кансэнсусу, бо для прасоўвання пэўных палітычных рашэнняў яны мусяць абапірацца на такія ўяўляльныя канструкты, як тая ж грамадская думка, бо іншага спосабу камунікацыі з масай людзей яны не маюць, але хочуць пэўным чынам задаволіць натуральнае памкненне людзей неяк уплываць на палітыку сваёй дзяржавы, хаця, натуральна, усе рашэнні будуць прымаць самі «за сцэнай».

Больш за тое, індывіды, хаця і могуць адчуваць, што імі маніпулююць, схільныя паддавацца ўздзеянню прапаганды, каб мець задавальненне быць часткай грамадскага цэлага. Асобнаму індывіду важна быць праінфармаваным і прыналежным да прыняцця дзяржаўных рашэнняў, а прапаганда гарантуе яму гэтую ўцягнутасць ці прынамсі яе ілюзію. Індывідам робіцца неабходная прапаганда, таму што «яны сутыкаюцца з выбарамі і рашэннямі, што патрабуюць спеласці, веды і прасцягу інфармацыі, якіх яны не маюць і не могуць мець»[44]. Індывід проста не ў стане прыняць той факт, што сам ён не здатны сфармаваць уласнае меркаванне без чужой дапамогі, і патрапляе ў пастку паміж жаданнем разумець і дзейнічаць і няздольнасцю гэта зрабіць самастойна. Прапаганда ж штучна задавальняе гэтую патрэбу, маскіруючы некампетэнтнасць чалавека і змушаючы прымаць свае загадзя сфармуляваныя «простыя» адказы за ўласныя меркаванні. Паколькі індывіду вельмі дыскамфортна знаходзіцца ў стане суворай і малазразумелай рэа-

---

43 Гл., напрыклад, разважанні С. Жыжэка наконт знакамітай сімвалічнай катастрофы – (медыя)падзеі 09/11, пра якую ён піша: «Тое, што адбылося 11 верасня, ёсць экран фантазматычнага бачання, што ўвайшоў у нашую рэальнасць. Гэта не рэальнасць патрапіла ў нашыя візіі, але візія ўвайшла і разбурыла нашую рэальнасць (то-бок сімвалічныя каардынаты, што вызначаюць нашае ўспрыманне рэчаіснасці)». І наўпрост сцвярджае, што спосаб дзеяння тэрарыстаў і рэакцыі грамадзян ЗША фарматаваліся медыявобразамі і чаканнямі, спароджанымі амерыканскімі медыя і маскультурай. С. Жижек. *Добро пожаловать в пустыню Реального*, Пер. с англ. Артема Смирного, М.: Фонд «Прагматика культуры» 2002, 24.

44 Ellul. op. cit., 139.

льнасці і ён мае шмат псіхалагічных і ідэйных прычын быць там, дзе ён ёсць, яму больш камфортна бачыць свет у масках ідэалогіі і прапаганды, іх сэнсах і каштоўнасцях, якія прыдаюць яму адчуванне ўласнае значнасці і інфармаванасці. Ужо на гэта вельмі лёгка купляюцца нават рэфлексіўныя індывіды з неблагімі інтэлектуальнымі здольнасцямі, бо чым яны разумнейшыя, тым больш адчуваюць сваю некампетэнтнасць і няпэўнасць стану перад тварам сусветных падзей без належнай прапагандысцкай падтрымкі.

Пры гэтым варта разумець, што феномен сучаснай прапаганды, пра які разважае Ж. Элюль, не мае амаль нічога супольнага з тымі ранейшымі формамі прапаганды і агітацыі, якія былі распаўсюджаныя ў дамадэрную эпоху, прыкладам у сярэдзіне XIX ст., і зводзіліся да псіхалагічных маніпуляцый і навязвання ідэй ці спосабаў дзеяння адных груп ці індывідаў іншым групам ці паасобным людзям дзеля дасягнення пэўных мэт. Найноўшая прапаганда, як піша Элюль, больш не імкнецца змусіць людзей «паверыць» у пэўныя ідэі альбо факты ці схіліць да сваёй ідэалогіі: «Мэтай мадэрнай прапаганды больш не ёсць мадыфікацыя ідэй, але правакаванне дзеяння. Гэта больш не змяненне прыхільнасці да нейкай дактрыны, але змушэнне індывіда ірацыянальна трымацца працэсу дзеяння. Гэта больш не трансфармацыя думкі, але паўставанне актыўнай і містычнай веры»[45]. Прапаганда закранае ўжо не толькі непасрэдна прастору свядомасці індывіда, але спрабуе мадыфікаваць усё ейнае асяроддзе. Так, яна спрабуе атачыць чалавека ўсімі магчымымі шляхамі як з боку пачуццяў, гэтак і ідэй, гуляючы на ягонай волі альбо патрэбах, свядома альбо падсвядома, суправаджаючы яго і ў публічным, і ў прыватным жыцці. Па сутнасці, усё асяроддзе чалавека мусіць працаваць на тое, каб выпрацаваць цэласную сістэму тлумачэння свету і спараджаць стымулы для дзеяння як спецыяльна арганізаваны міф, што спрабуе авалодаць асобай. Гэтае асяроддзе пачынае сябе выяўляць перадусім як сукупнасць канвенцыянальных патэрнаў і стэрэатыпаў, што фармуюць той кагнітыўны ўзровень дзейнасці свядомасці чалавека, які прапагандыст можа выкарыстоўваць як свой матэрыял для канструявання. Паводле Элюля, добра зробленая прапаганда заўжды арыентуецца на тыя калектыўныя міфы, якія падзяляюцца грамадствам, прыкладам міф пра нацыю, пра героя, пра шчасце, але можна ў працяг сцвярджаць, што ў доўгатэрміновай перспектыве прапаганда можа сама працаваць на стварэнне новых калектыўных міфаў, напрыклад, для нашага рэгіёна – міф пра славянскую еднасць – трыадзіны народ, пра адметны шлях развіцця славянскай цывілізацыі, і да т.п., якія пачалі закладвацца яшчэ за часамі Расійскай імперыі. Калі прапаганда змяшчае ў сабе элементы калектыўнай міфалогіі, базавых стэрэатыпаў грамадства, яна ўспрымаецца як натуральная і адпаведная агульнаму светапогляду чалавека, калі толькі дадаць, што

45 Ibid, 25.

гэты светапогляд сам сфармаваны пад уздзеяннем доўгатэрміновай прапаганды, незаўважнай для свядомасці.

Такую доўгатэрміновую і малазаўважную прапаганду Жак Элюль называе сацыялагічнай, паколькі яна грунтуецца на імкненні грамадскага цэлага інтэграваць чалавечыя адзінкі ў сабе праз уніфікацыю іх паводзін паводле пэўнага патэрна, на пашырэнні свайго стылю жыцця і ўплыву на вонкавыя групы. Па сутнасці, асноўная задача падобнай прапаганды – сцвердзіць прывабнасць і прыцягальнасць усталяванага грамадскага парадку, спосабаў міжчалавечых зносін, наважанага ладу жыцця праз усе сацыяльныя каналы – напрыклад, можна прыгадаць пашыраную ўпэўненасць пра перавагу савецкага ладу жыцця ў грамадзян былога СССР без магчымасці нават наўпроставага параўнання, што магло перарастаць у феномен непрыняцця замежнага ладу жыцця нават свядомымі савецкімі эмігрантамі. Элементам прапаганды робіцца сам лад жыцця, якім прасякнутыя індывіды, і таму яны пачынаюць выражаць яе далей праз фільмы, кнігі, творы мастацтва, то-бок не толькі медыя, але і ўся інфраструктура жыцця чалавека робіцца праваднікам пэўнай прапагандысцкай праграмы. Гэта ўжо не наўмысная, а спантанная прапаганда ў межах пэўнай культуры ці нацыі: яна культывуе свой лад жыцця як найлепшы і часта супрацьпастаўляе яго чужым як горшым ці менш пажаданым. Чалавек прасякнуты прапагандай праз свае звычкі і падсвядомыя стэрэатыпы дзеяння, таму ён схільны ўважаць інспіраваныя ў ім спосабы прыняцця рашэння, сістэму распазнавання дабра і ліха, новыя крытэрыі выбару як уласцівыя яму самому па сабе, ён «прымае іх спантанна, нібыта ён абіраў іх самастойна»[46]. І пасля ўяўляе сваю карціну свету як найбольш натуральную і ўважае кожнага, хто падзяляе яго стыль і лад жыцця, на «анёльскім баку», у той час як астатніх –хутчэй за ўсё як «кепскіх хлопцаў» ці «няправільных асоб». Сацыялагічная прапаганда не дзейнічае непасрэдна, але стварае добры падмурак, каб на ёй можна было развіваць формы непасрэднай прапаганды. Гэта тлумачыць, чаму, прыкладам, людзі з «савецкім складам мыслення» альбо адпаведным ладам жыцця ў нашым рэгіёне, калі нават самі яны далучаюць сябе да інтэлектуальных колаў, робяцца настолькі прыдатнымі для прапаганды, якая выкарыстоўвае гэтыя адметнасці як цноты і супрацьпастаўляе іх заходняй бездухоўнай цывілізацыі, яе нетрадыцыйным каштоўнасцям і да т.п. і схіляе да прыняцця рэваншысцкай рыторыкі ці патрыятычна-абарончага дыскурсу, фактычна ж – да падтрымкі любых дзеянняў улады.

Як сцвярджае Элюль, найлепшым спосабам уплываць на індывіда для прапаганды з'яўляецца гуртаванне яго ў масы. Трэба, аднак, разумець, што маса – гэта зусім новая сацыяльная з'ява мадэрнага веку, якая адрозніваецца ад традыцыйных форм гуртавання. Элюль часам выкарыстоўвае такі тэрмін, як «апрычоны натоўп», бо індывід у межах масы існуе адначасова і з адчуваннем

46 Ibid., 64.

прыналежнасці да нейкай віртуальнай большасці, і з пачуццём апрычонасці, фізічнай адзіноты. Прапагандзе лягчэй кіраваць індывідам праз гэтую амбівалентнасць: яна звяртаецца нібыта да кожнага свайго рэцыпіента індывідуальна, але робіць гэта стандартызавана, як да чалавека-масы, да кожнага і ўсіх разам, што фармуе адчуванне ілюзорнай еднасці ў людзей. Ілюзорнай таму, што, як сцвярджае іншы вядомы сацыяльны тэарэтык XX ст. Жан Бадрыяр, маса – гэта «чорная дзірка» сацыяльнага, яна аморфная і інертная, не здольная спараджаць з сябе анічога[47]. Нават тую ж грамадскую думку. Адчуўшы прыналежнасць да масы, чалавек уяўляе, што дасягае еднасці з іншымі людзьмі, ён інтэграваная частка супольнасці і падзяляе агульныя ідэалы, у той час як гэтая еднасць існуе збольшага на экране прапагандыста і доўжыцца не долей за той тэрмін, каб выклікаць патрэбную рэакцыю публікі. Ствараючы татальны ландшафт схаванай прапаганды, якую чалавеку складана заўважаць ці адаптаваць, яе арганізатары па сутнасці ствараюць і аб'ект прапаганды – саму супольнасць людзей як масу: не згуртаваную сябрыну ці грамадзянскую супольнасць, здольную да актыўнай самастойнай дзейнасці, а пасіўны і інертны натоўп, які дзейнічае тады, калі тое патрэбна прапагандысту. Па сутнасці, прапагандысцкія метады і скіраваныя на тое, каб схіліць да актыўнага ці пасіўнага ўдзелу ў сваіх дзеяннях[48] масу індывідаў, знітаваных псіхалагічна за кошт маніпуляцый і ўцягнутых у агульнасць арганізацыйных дачыненняў. Прапаганда паслядоўна змяншае ўзровень персанальнай актыўнасці і самастойнага мыслення людзей і залучае іх у агульныя трэнды, сфабрыкаваныя ўстаноўкі і меркаванні. «Прапаганда пакладае мэты, арганізуе індывідуальныя рысы ў сістэму і выплаўляе іх пад пэўны шаблон праз стандартызацыю актуальных ідэй, замацаванне прывілеяваных стэрэатыпаў і ўсталяванне ўзораў мыслення ва ўсіх галінах»[49], і як вынік з таго – персанальнае крытычнае меркаванне замяшчаецца «грамадскім меркаваннем» і індывід успрымае волю, пафас і думку групы як свае ўласныя. Залучаючы сябе татальна ў групавую дынаміку, цалкам інтэгруючы сябе, індывід прыходзіць на справе да самаадчужэння, бо змушаны да існавання ва ўмовах, да якіх яго схіляе грамадства, надаючы яму цалкам штучную і нерэальную рэальнасць: прыкладам, жыцця ў атачэнні ворагаў, неабходнасці рэзкай агрэсіі і экспансіі навонкі дзеля забеспячэння сабе жыццёвай прасторы і г.д. Чалавек вельмі схільны да групавой лаяльнасці псіхалагічна, і апошняе добра па-

---

47 Ж. Бодрийар: *В тени молчаливого большинства, или Конец социального*, Пер. с фр. Н. В. Суслова, Екатеринбург: Издательство уральского университета 2000.

48 Актыўная прапаганда дзейнічае праз мабілізацыю канкрэтных індывідаў, прыкладам ехаць добраахвотнікамі на вайсковыя дзеянні ў падтрымку інтарэсаў сваёй дзяржавы, пасіўная – праз псіхалагічную падтрымку дзеянняў на ўзроўні, прыкладам вядомага прапагандысцкага мема «Крымнаш!».

49 Ellul, op. cit., 162.

цвярджаюць вядомыя эксперыменты Саламона Аша[50]; таксама людзі надта схільныя падначальвацца аўтарытэту і скідваць з сябе крытычнае мысленне разам з адказнасцю безадносна ўзроўню іх адукацыі, эрудыцыі і іншых падобных фактараў, што даказваюць эксперыменты С. Мілгрэма[51]. Прапаганда схільная выкарыстоўваць гэтыя эфекты на сваю карысць і схіляць да прыняцця сваёй веры нават ад пачатку рэфлексіўных індывідаў, то-бок і частку інтэлектуалаў таксама.

Прапаганду дакладна не трэба блытаць з агітацыяй, бо агітацыя, паводле Элюля, толькі адна з формаў прапаганды, якая патрэбная для тэрміновай і хуткай мабілізацыі мас на пэўныя дзеянні і таму выцягвае індывіда з яго нармальнага стану. Большая ж вага надаецца нябачнай, але дзейснай інтэграцыйнай прапагандзе, якая сцвярджае пэўныя культурныя нормы, падтрымлівае належны «лад жыцця» і «спосаб мыслення» і культывуе міфы на нацыянальным ці дзяржаўным узроўні. Гэта – прапаганда, што ідзе ад грамадскага цэлага, яна сталая і відавочная паводле сваіх наступстваў, хаця і не настолькі наўпрост заўважная, як агітацыя. Тыя сацыяльныя групы, што стаяць за прапагандай, імкнуцца стварыць падзел у грамадстве на дзве няроўныя часткі, каб «сцвердзіць перавагу сваёй уласнай групы і злачыннасць іншых»[52], узвышаючы звычайна долю сацыяльнай падтрымкі існуючай улады і дэманізуючы і маргіналізуючы яе апанентаў, што стварае ў чалавека, які не падзяляе карціну рэальнасці прапаганды, псіхалагічны дыскамфорт ад знаходжання ў абсалютнай і дэкласаванай меншасці, што вытрымлівае зусім не кожны, інтэлектуал у тым ліку. Ствараецца псіхалагічны прэсінг, які ўзмацняе стэрэатыпы, міфы і веры, распаўсюджаныя ў грамадстве, і які дае моцны стымул для апраўдання сваёй пазіцыі і дзеянняў у аб'ектаў прапаганды; улучаныя ж у пэўную дзейнасць рэфлексіўныя

[50] У выпадку салідарнага меркавання групы індывід схільны збольшага далучацца да агульнага меркавання і ахвяраваць сваім уласным, нават згодны менаваць відавочна чорнае белым ці няроўнае роўным і ўводзіць сябе ў стан абсалютнага прыняцця падобнай візіі рэальнасці ажно да моманту, пакуль хтосьці ў групе ці па-за групай не сцвердзіць «рэалістычны» пункт погляду, як у вядомай казцы Г.К. Андэрсана пра голага караля. Пры пэўных маніпуляцыях гэта дзейнічае нават на вельмі крытычных, амбітных і ўпэўненых у сабе індывідах. Дарэчы, у навукова-папулярнай форме эксперыменты Аша былі неаднакроць экранізаваныя ва Украіне ў 1971 («Я и Другие», рэж. Ф. Собалеў), 2010 («Я и Другие», рымейк, рэж. У. Бродскі) і 2015 («Обыкновенные Зомби. Как работает ложь», рэж. І. Паўлюк). Падрабязней гл.: S.E. Asch: *Effects of group pressure on the modification and distortion of judgments* // H. Guetzkow (Ed.). Groups, leadership and men, Pittsburgh, PA: Carnegie Press 1951, 177–190.

[51] Людзі, пастаўленыя ў экстрэмальную сітуацыю навуковага эксперыменту, былі гатовыя да прычынення гвалту іншым у нашмат большай ступені, чым яны тое б зрабілі самастойна пад ціскам аўтарытэту «эксперыментатара» і не схільныя да рэфлексіі маральнасці сваіх дзеянняў падчас іх ажыццяўлення. Падрабязней гл.: S. Milgram: *Obedience to Authority; An Experimental View*, Harpercollins 1974.

[52] Ellul, op. cit., 213.

індывіды самі потым схільныя да «апраўдання» сваіх учынкаў тым, што свядома скажаюць сваю карціну свету ў адпаведнасці з той оптыкай, што прапануе ім прапаганда, бо гэта пазбаўляе іх канфлікту паміж уласнымі ўстаноўкамі і дзеяннямі. Прапаганда дзейсная, калі адна сацыяльная група стварае дыспрапорцыю ўласнай значнасці ў вачах індывідаў і мас, а не калі яна толькі адна з іншых, таму дзеля эфектыўнай прапаганды падобныя групы імкнуцца да поўнага дамінавання ў палітычнай і эканамічнай галінах жыцця. Пры гэтым варта разумець, што прапаганда, хаця і дзейнічае пераважна на ўзроўні эмоцый і падсвядомых установак, тым не менш мусіць, як сцвярджае Элюль, апеляваць нібыта да розуму і жыццёвага досведу, калі падае інфармацыю і маніпулюе з фактамі, бо з'яўляецца пераважна прадуктам эпохі мадэрну. Гэта не значыць, што яна мусіць быць рацыянальнай у сваёй аснове, каб задаволіць прагу індывіда абапірацца на факты пры прыняцці рашэнняў і дзеяннях, яе задача даць ірацыянальны адказ на тое, што мае рацыянальныя і фактычныя элементы ў сваёй аснове: яе дакладнасць грунтуецца не на адпаведнасці фактам самім па сабе, але ў «адпаведнасці рэальнасці», дакладней той візіі рэальнасці, якую стварае прапаганда пры дапамозе маніпуляцый з фактамі. Прапаганда можа пазбягаць наўпроставай маны, але маскіруе праўду пад фальшывымі ці скампраметаванымі інтэрпрэтацыямі. Яе ўздзеянне застаецца пасля таго, як нават успамін пра тыя «факты», на якія яна абапіралася, знікае з чалавечай памяці, індывід і наогул не схільны доўга прыгадваць тую інфармацыю, што дае яму прапаганда, ён пакідае мемы-патэрны, кшталту «адэская Хатынь», «крывавая хунта» і г.д. Зрэшты, індывід будзе дзейнічаць з апорай не на факты, але на «эмацыйны ціск, візію пэўнай будучыні, міф»[53], але сам для сябе абгорне свой момант дзеяння яго нібыта рацыянальна-фактычнай абгрунтаванасцю. Таму сучасная прапаганда, як «новая міфалогія», не мае клапаціцца пра сваю несупярэчлівасць ці вернасць ідэалогіі, яна можа ствараць кангламераты самых розных і нават супярэчлівых ідэалагем, бо канчатковую рацыяналізацыю карціны свету зробіць сам індывід.

Гэта скіроўвае нас да тэмы суадносін прапаганды і ідэалогіі. Дарэчы, яшчэ адным важным момантам кансцыентальнай вайны, паводле Ю. Грамыкі, з'яўляецца адрозненне ідэалагічнага і кансцыентальнага спосабаў панавання: першы абмяжоўвае легітымнае поле выказванняў дыскурсам аднаго дазволенага тыпу і рэпрэсіўнымі сродкамі яго зацвярджае, у той час як улада над свядомасцю дазваляе любыя формы мыслення і выказвання, але кантралюе формы свядомасці і самасвядомасці, то-бок механізмы выпрацоўкі выказванняў, тым самым даючы чалавеку ілюзію свабоднага спараджэння думак і пачуццяў у належным фармаце. Прыкладам, чалавек прамаўляе штосьці праз патрыятычна-ахоўную рыторыку і лічыць яе самазразумелым спосабам разважання, як тое зараз робіць частка расійскай творчай і навуковай інтэлігенцыі. Сучасная прапаганда

53 Ibid., 86.

больш не імкнецца заставацца ў рэчышчы той альбо іншай ідэалогіі, бо і наогул у сённяшнім свеце бракуе выразнай ідэалогіі. Напрыклад, расійскі журналіст Ігар Якавенка называе той узор новай прапаганды, якую ажыццяўляюць сучасныя расійскія СМІ, не інакш як «медыяфрэніяй», упіраючы на тое, што 1) там «няма ніякай сістэмы каштоўнасцей, базавых тэкстаў альбо поглядаў», толькі разбурэнне любых сталых поглядаў і палітычны цынізм з адзіным імператывам – захаваннем улады існага прэзідэнта, што дазваляе спалучаць, здавалася б, неспалучальнае (прыкладам, ідэі камунізму з манархічнымі і нацысцкімі ідэаламі); 2) дамінуе татальнасць падману і кропкавага гвалту пад агульным слоганам «Усе хлусяць!»; 3) падтрымліваецца адвольнасць і слабасць лідараў грамадскай думкі, што прамаўляюць у медыя, якіх, па сутнасці, на гэтае месца самі медыя і «прызначаюць» пад ціскам уладаў; 4) ажыццяўляецца татальны дзяржаўны кантроль над медыярэсурсамі, які не дазваляе з’явіцца самастойным уплывовым СМІ з масавай аўдыторыяй для стварэння альтэрнатыўнай версіі падачы медыяпадзей[54]. У адным з ранейшых сваіх тэкстаў я таксама акрэсліваў згаданы феномен замены традыцыйных ідэалогій у рэчышчы палітычнай прапаганды праз масмедыя на новыя формы ідэалагічнага мыслення – постідэалогіі альбо новыя міфалогіі, асноўнай прыкметай якіх з’яўляецца менавіта спалучэнне адвольных элементаў старых ідэалогій, упор на эмоцыі, а не рацыянальную аргументацыю, ужыванне «такіх структур азначэння, якія выбудоўваюць відавочныя апазіцыі “сваё-чужое”, “святло-цемра”, “праўда-хлусня”, базуюцца на збольшага эмацыйна-ірацыянальных міфах гістарычнага, сацыяльна-псіхалагічнага і іншага кшталту, спараджаюць замкнёную логіку функцыянавання дыскурсу, якая ніяк не рэагуе на вонкавую крытыку альбо контрпрыклады»[55].

Паводле Ж. Элюля, сучасная прапаганда не грунтуецца на пэўнай ідэалогіі, хутчэй апошняя ёсць для яе не больш як матэрыял ці сродак, таму прапагандыст звычайна сам цынічна «не верыць» у тыя ідэалагемы, якія сам і прасоўвае, але дзейнічае на карысць той дзяржавы, якая яго наймае: «Усё больш і больш прапагандыст – гэта тэхнічны супрацоўнік, які выкарыстоўвае камунікацыйныя сродкі матэрыяльных медыя і псіхалагічныя тэхнікі; і ў сарцавіне ўсяго гэтага ідэалогія – гэта толькі адна з другарадных і замяняльных шасцерняў»[56], якую можна прыладжваць пад дух моманту. Прапагандыст стварае з ідэалогій альбо набор словаў-стымулаў, кшталту

---

[54] И. Яковенко: *У системы лжи Путина есть четыре отличия от обычной пропаганды — российский журналист* // ONLINE.UA. Рэжым доступу: http://www.news.online.ua/749691/u-sistemy-lzhi-putina-est-chetyre-otlichiya-ot-obychnoy-propagandy-rossiyskiy-zhurnalist/. Дата доступу: 20.10.2016.

[55] П. Баркоўскі: *Новая сацыяльная аналітыка*. Передумовы і магчымасці (II) // Наше мнение. Сайт экспертного сообщества Беларуси. 17.02.1014. Рэжым доступу: http://nmnby.eu/news/analytics/5471.html. Дата доступу: 20.10.2016.

[56] Ellul, op. cit., 197.

«сацыяльная справядлівасць», «дэмакратыя», «дзяржава» і г.д., для выклікання пэўнага тыпу рэакцый, альбо міфалагемы дзеля апраўдання належнага кшталту дзеянняў, таму напачатку ідзе дзея, а за ёй толькі ідэалогія як апраўданне. Прапаганда бадай не стварае новыя міфы, але добра эксплуатуе ўжо наяўныя, змяняючы і мадыфікуючы іх пад свае патрэбы. Гэта робіцца магчымым за кошт так званай «гарызантальнай прапаганды», што ажыццяўляецца на ўзроўні сацыяльнай групы, а не іерархічна. Прапаганда атакуе прынцыповыя сімвалы культуры, яе ўстаноўкі, якія фарматуюць светапогляд і свядомае індывідаў. Галоўная задача для прапаганды – выкарыстаць абумоўленыя сімвалы як трансмітары культуры, каб ажыццявіць свае мэты: «Кожны індывід захоўвае вялікую колькасць стэрэатыпаў і ўсталяваных тэндэнцый; з гэтага арсеналу прапагандыст мусіць абіраць тыя, якія найпрасцей мабілізаваць, якія надаюць найбольшую вагу дзеянню, што той хоча спрычыніць»[57], таму прапаганда можа нападаць непрыкметна, са спіны, задаваць новыя цэнтры інтарэсу, што дэвальвуюць папярэдне абраныя пазіцыі, пераскіроўваць перадразвагі і забабоны, змушаць чалавека нават дзейнічаць насуперак свайму меркаванню без усведамлення таго. Паводле Грамыкі, кансцыентальная вайна скіраваная менавіта на змяненне і скажэнне базавых культурных норм і прынцыпаў, на якія абапіраецца свядомасць; паводле Элюля можна скарэктаваць, што прапаганда як сродак кансцыентальнай вайны можа як працаваць на захаванне і абарону патрэбных міфаў і стэрэатыпаў у культуры, так і свядома скажаць і змяняць гэтыя міфы і стэрэатыпы, тым самым уплываючы на ідэнтычнасць, і рабіць тое і са сваёй культурай, і з чужой[58]. Таму індывіду, нават рэфлексіўнаму, вельмі цяжка супрацьстаяць прапагандзе, якая маніпулюе ідэалогіямі, міфамі і культурнымі нормамі, і робіць тое на такім узроўні, дзе рацыянальная крытыка і аргументацыя часта малаэфектыўныя.

Такім чынам, можна падсумаваць, што ў сучаснай прапаганды ёсць безліч магчымасцей прамога і непрамога ўздзеяння на індывіда, нават рэфлексіўнага і высокаадукаванага, якія і выкарыстоўваюцца ў часе вядзення кансцыентальных войнаў. І шмат якія механізмы такога ўздзеяння можна патлумачыць пры дапамозе сучаснай тэорыі прапаганды Ж. Элюля. Па-першае, гэта стварэнне «пашыранай» свядомасці індывіда праз залучэнне экранных тэхналогій, якія робяцца неабходнымі дзеля ўсведамлення комплексных падзей, бо інакш тыя застаюцца незразумелымі не-экспертнаму колу. Гэта змушае нават рэфлексіўных індывідаў мець базавы ўзровень даверу да «карцінкі», якая паказвае падзею так, «як яно было насамрэч». Па-другое, уздзеянне праз «сфабрыкаваны грамадскі кансэнсус», то-бок пакладанне на ўяўную грамадскую думку і прамое

57 Ibid., 35.

58 Напрыклад, як пад уздзеяннем расійскай прапаганды ва ўкраінскім грамадстве пакрыёма выпрацоўваецца міф пра «данбаскі народ» як протанацыю, «грамадзянскую вайну» як кшталт разумення баявых дзеянняў на ўсходзе краіны, і інш.

абапіранне на ідэалогію і прапаганду як на спосабы дабудоўвання ўласнай карціны свету індывідаў, што, як і ў папярэднім пункце, звязана са складанасцю і незразумеласцю агульнай сітуацыі для апрычонай свядомасці. Па-трэцяе, уціск праз фармаванне калектыўнай міфалогіі як «актыўнай веры», што працуе на доўгатэрміновай аснове як «сацыялагічная» прапаганда і стварае гатунак чалавека пэўнага складу мыслення, напрыклад ментальна «савецкага чалавека», чые патэрны свядомасці заўжды знаходзяцца ў «рэчышчы» актуальнай прапаганды. Па-чацвёртае, уплыў праз актыўнае выкарыстанне механізмаў «масавізацыі» свядомасці індывіда і групавую лаяльнасць, што штучна здымае частку рэфлексіўнага пласту свядомасці індывідаў і ператварае іх у суб'ектаў агульнага калектыўнага дзеяння, прыкладам патрыятычнага ўздыму. Па-пятае, уздзеянне праз падманную рацыяналізацыю сваёй рыторыкі, калі апрычоныя і незвязаныя паміж сабой факты, выказаныя нібыта ў рацыянальным дыскурсе аргументацыі, паядноўваюцца ўжо ў свядомасці самога індывіда як эфекты апраўдання ўласных дзеянняў з апорай на тыя факты. Па-шостае, адвольнае выкарыстанне і маніпуляванне рознымі ідэалогіямі і ідэалагічнымі вобразамі дзеля дасягнення прагматычнага эфекту прапаганды на ўзроўні прапаганды «гарызантальнай», што перавытлумачае базавыя сімвалічныя коды культуры і структуры ідэнтычнасці ў належным святле яшчэ на дарэфлексіўным узроўні.

## 3.

Нарэшце, калі нават мы можам апісаць асноўныя механізмы ўздзеяння на свядомасць індывідаў праз сродкі прапаганды кансцыентальнай вайны, застаецца, прынамсі, пытанне: ці існуюць нейкія механізмы бяспекі на індывідуальным ці грамадскім узроўні, якія б абмяжоўвалі ўздзеянне прапаганды на свядомасць і палягчалі выжыванне крытычнага інтэлекту ў часе баявых дзеянняў падобнай вайны. Той жа Ю. Грамыка, які разважае пра пагрозу кансцыентальнай вайны для бяспекі Расіі, бачыць такія механізмы, па сутнасці, у двух рэчах. Па-першае, ужо згаданая аўтэнтызацыя, за якой стаіць наўпрост контрпрапаганда ці свядомая прапаганда ўласнай сістэмы прыярытэтаў, каштоўнасцей і культурных прыкмет насуперак чужым. Асноўная праблема з аўтэнтызацыяй палягае ў тым, што сучасныя грамадствы, за выключэннем зусім традыцыйных ці штучна гамагенізаваных, не маюць адзінай дакладнай мадэлі ідэнтычнасці, водле ўзору якой мусіць разгортвацца грамадства як цэлае. Нават тая ж Расія з'яўляецца вельмі складаным поліканфесійным, шматнацыянальным, федэралізаваным суб'ектам, каб змяшчаць на месца ўсяе гэтай разнастайнасці нейкі адзіны ўзор нацыянальнай ідэнтычнасці і культуры. Тым болей, калі гаворка ідзе пра грамадствы з куды як даўнейшай традыцыяй мультыкультуралізму. Шлях аўтэнтызацыі фактычна можа прыводзіць адно да самазамыкання пэўнага грамадства і выхаду ў варожую пазіцыю да ўсяго іншага

свету, што спрычыняе псіхалагічныя, палітычныя і эканамічныя наступствы непажаданай моцы і прыводзяць падобную культуру да ізаляцыі і аўтаркіі.

Іншы шлях, які таксама разглядае Грамыка, гэта разгортванне спецыяльных тэхналогій, якія ён называе «метаэкраннымі», ці «метаІнтэрнэтнымі», а таксама праблемная форма СМІ[59]. Першыя павінны забяспечыць маніторынг таго, якія формы і спосабы рэакцый выклікаюць тыя альбо іншыя экранныя прыёмы і тэхналогіі, як адбываецца іх усведамленне і адаптацыя, у той час як другая мусіць клапаціцца пра наяўнасць шырокага спектру трактовак і інтэрпрэтацый пэўнай падзеі, каб ствараць максімальна панарамную карціну таго, што адбываецца і праблематызаваць адзіны пункт гледжання, уласна прапаганду. Гаворка ідзе, па сутнасці, пра захаванне прасторы пэўнай крытычнай рэфлексіі і гэта той сродак, якім збольшага і карыстаюцца людзі, што імкнуцца супрацьстаяць прапагандзе: імкненне ведаць інфармацыю і версіі падзей ад усіх бакоў, супастаўленне і адсейванне падманнай інфармацыі і «накідаў». Такая тактыка досыць эфектыўная. Але патрабуе ад чалавека нашмат больш часу, большай псіхалагічнай устойлівасці, лепшага разумення і агулам лепшай інтэлектуальнай падрыхтоўкі, якія часам не могуць сабе дазволіць, прыкладам, дзеячы культуры ці вядомыя спартоўцы, хаця іх і прынята ўважаць за грамадскія эліты і фармавальнікаў грамадскай думкі. Зрэшты псіхалагічны эфект «палягчэння жыцця» прапагандай апісвае і Ж. Элюль, падкрэсліваючы, чаму індывіду ў масе больш камфортна падзяляць ідэі прапаганды, чым супрацьстаяць ёй, але пра тое гаворка ішла яшчэ раней. І першы, і другі прапанаваныя шляхі з'яўляюцца збольшага пасіўна-абарончымі і арыентуюцца на спосабы пазбягання эфектаў прапаганды ці на контрпрапаганду, фактычна такую ж прапаганду, толькі нібыта са «станоўчым» знакам сваёй, аўтэнтычнай прашыўкі свядомасці.

Актыўная форма змагання з прапагандай як сродкам уздзеяння кансцыентальнай вайны прапанаваная ўкраінскім філосафам Сяргеям Дацюком. Па-першае, аўтар адрознівае два тыпы прапаганды ў актуальнай інфармацыйнай вайне: 1) прапаганда паасобных ідэй, прыкладам ідэі «рускага свету», «археамадэрну», «імперыі»; і 2) дыскурсіўная прапаганда, прыкладам прасоўванне імперска-каланіяльнага дыскурсу, дыскурсу справядлівасці і г.д. Да актыўнай прапаганды дадаецца таксама механізм цэнзуры, што «зачышчае» інфармацыйную прастору ад непажаданых альтэрнатыўных дыскурсаў і выказванняў – гэта цэнзура асобаў, пэўных тэм, адмысловых сэнсаў і цэнзура праз фармат (калі аднаму тыпу дыскурсу надаецца больш увагі і часу чым астатнім)[60] – і таму з'яўляецца

59 Громыко, указ. соч.

60 С. Дацюк: *Семантическая война против путинской России* // Хвиля. Новостной и аналитический портал. Рэжым доступу: http://hvylya.net/analytics/society/semanticheskaya-voyna-protiv-putinskoy-rossii.html. Дата доступу: 20.10.2016.

прыдатным асяроддзем для разгортвання прапаганды. Згаданым формам прапаганды не варта супрацьпастаўляць наўпроставую контрпрапаганду, лічыць Дацюк, але неабходным рэжымам змагання робіцца для яго механізм гэтак званай семантычнай вайны. Паводле аўтарскага вызначэння, «семантычная вайна – гэта від кансцыентальнай вайны, калі гаворка ідзе пра змяненне канцэптуальных аснаванняў масавай свядомасці праз свядомасць лідараў думкі, то бок свядомасць інтэлектуалаў», гэта вайна за змяненне мысленчых установак, альбо «канцэптуальная вайна за сэнсы і перспектывы будучыні: канструктыўныя, сеткавыя, агульначалавечыя, касмічныя»[61]. Асноўнае адрозненне семантычнай вайны ад іншых формаў кансцыентальнай і інфармацыйнай войнаў – свядомы і добраахвотны ўдзел у ёй інтэлектуалаў, якія схільныя змагацца за грамадскую думку насуперак эфектам прапаганды.

Па-другое, аўтар зазначае, што праблемай змагання за свядомасць інтэлектуалаў з'яўляецца не толькі наяўнасць відавочных складнікаў прапаганды, якія скажаюць і падмяняюць сэнсы і тэзы, але глабальнае пашырэнне сферы «бессэнсоўнага» – гэта значыць свядомае выкараненне самой сэнсавай прасторы і замена яе формамі істэрычнай, эпатаванай і агрэсіўнай свядомасці, няздатнай да аналізу ўласных пачаткаў і аргументаў. Таму змаганне мусіць адбывацца не толькі за вытворчасць новых сэнсаў і крытычную рэфлексію, але і за разбурэнне прасторы бессэнсоўнага, дэнансацыю прыхаванай адсутнасці сэнсаў за прапагандысцкімі штампамі, дэманстрацыю бяздумнасці інтэлектуалаў як прычыны такой бессэнсоўнасці, знішчэнне архаічнай і агрэсіўнай семантыкі.

Семантычная вайна так называецца перш за ўсё таму, што адбываецца ў прасторы культурных знакаў і сімвалаў, у плане дыскурсіўнай семантыкі. Яе асноўным спосабам працякання з'яўляецца барацьба за дыскурсы, але не шляхам забеспячэння дамінацыі нейкага ўжо існага ці знішчэння альтэрнатыўных, але праз стварэнне новых дыскурсаў, за якімі стаяць адпаведныя мысленчыя ўстаноўкі. Сцвярджэнне пэўных установак патрабуе, апрача дыскурсу як формы сваёй рэалізацыі, яшчэ і належнай прасторы – новых форм камунікацыі, якія б забяспечвалі большую долю асэнсаванасці рэчаіснасці і доўгатэрміновасць існаванню мыслення. Гэтая камунікацыя павінна быць супрацьлегласцю тактыкам замбавання і маніпулявання свядомасцю, то бок абапірацца на прынцыпова непрапагандысцкія варункі мыслення і маўлення. Яна мусіць бачыць свой падмурак у грунтоўнай і перспектыўнай аргументацыі з належнай ацэнкай, аналізам, крытыкай і рознымі гатункамі рэфлексіі. Яе прывабнасць павінна зыходзіць з агульнага імкнення да ўвасаблення крытычнага, свабоднага і рэфлексіўнага досведу мыслення як інтэлектуальнага ідэалу, які звернуты пераважна на эліту грамадства – лідараў думкі, інтэлектуалаў, палітыкаў, экспертаў. Праз тое механізм семантычнай вайны не патрабуе вялікіх рэсурсаў на пра-

61 Там жа.

вядзенне масавых прапагандысцкіх кампаній, яна абапіраецца на рэсурсы вольнага супрацоўніцтва і далейшага развіцця высілкамі крытычных інтэлектуалаў, якія абіраюць бок ісціны, а не справядлівасці на франтах гэтай вайны, то бок яе хаду кантралюе мыслячае грамадства, а не палітычная ўлада. Гэта вайна вядзецца высілкамі пятай улады – улады разумення і рэфлексіі, інтэлектуальнай улады – праз уплыў на чатыры астатнія і на грамадства як такое.

Чаму для Дацюка падаецца істотным размежаваць тут ісціну (сэнс) і справядлівасць? Перадусім таму, што кантэкстуальнае паняцце справядлівасці толькі вонкава суправаджае паняцце ісціны, ператвараючы апошнюю ў праўду, якая ў кожнага свая! Гэта стварае эфект семантычнага рэваншызму: замацоўваюцца тыя старыя сэнсы, паняцці і ўяўленні, якія абапіраюцца на фундаменталісцкія і традыцыяналісцкія каштоўнасці, на адчуванне сваёй выключнасці і гістарычнай праўды, маральнага прыярытэту. Па сутнасці гэта кансервацыя наяўных уяўленняў праз архаічныя і вельмі лакальныя сэнсы, семантычны нігілізм, які імкнецца забіваць кожную дыскурсіўную інавацыю, апора на эмацыянальны і філістарскі погляд на свет, што спараджае агрэсіўную семантыку, якую стала выкарыстоўвае прапаганда. У той жа час тыя, хто абапіраюцца на прэзумпцыю сэнсу, менш схільныя да рэфлекторнага дзеяння, шукаюць перадусім яму аснаванні і пралічваюць наступствы, і іх задача адшукаць не праўду бягучага гістарычнага моманту, не даць гістарычнае апраўданне сваім дзеянням ці дзеянням сваіх палітыкаў альбо суграмадзян, але разважаць над сітуацыяй з пункту гледжання агульначалавечай логікі і прынцыпаў бесстаронняй маральнай ацэнкі. Падобная пазіцыя прадугледжвае пошукі найлепш аргументаваных поглядаў на падзею, зацвярджэнне сэнсу насуперак бессэнсоўнаму, і адстойванне свайго канцэптуальнага поля ацэнак і высноў ад прапагандысцкіх дыскурсаў, якія імкнуцца гэтыя сэнсы скарумпаваць: па-першае, праз пазіцыю, што ўсе сэнсы падазроныя і амбівалентныя, па-другое, праз наўпроставую агітацыю за свае сэнсы, якія толькі вонкава нагадваюць аргументацыйныя высновы, а збольшага з'яўляюцца эмацыйным пасланнем. Але тут слабым момантам пазіцыі абаронцаў ісціны з'яўляецца тое, што, калі ў межах семантычнай вайны адбываецца канцэптуальная інтэрвенцыя і новы дыскурс замацоўвае сваю ісціну насуперак татальнасці прапаганды, ён міжволі сам пачынае набываць вонкавыя прыкметы прапаганды. Канкуруючы за свядомасць простых грамадзян, лідары думкі мусяць спрашчаць аргументы, рабіць свае выказванні больш лаканічнымі і жорсткімі, а галоўнае не ведаць талерантнасці. Бо талераваць чужыя высновы ў семантычнай вайне, паводле Дацюка, адпаведна паразе: альбо ты прызнаеш чужыя аргументы больш вартымі і тады змяняеш пункт гледжання, альбо прызнаеш іх менш доказальнымі і застаешся на ўласнай пазіцыі. Такі падыход гарантуе непатрапленне ў семантычны нігілізм і рэлятывізм, да чаго схіляе інтэлектуалаў звычайна прапаганда, эксплуатуючы ўласцівую крытычнаму індывіду прагу ставіць усе думкі пад сумненне і не выз-

наваць абсалютных ісцін. Праблема можа быць у тым, што пазіцыя сваіх лепшых аргументаў можа «бранзавець» і наогул інтэлектуал можа спыніць звяртаць увагу на альтэрнатыўныя думкі і пазіцыі, як тыя, што сыходзяць з карумпаванага боку (а зусім не факт, што прапаганда выкарыстоўвае толькі падман і маніпуляцыі і не можа змяшчаць пэўныя аргументаваныя ідэі і меркаванні), з аднаго боку, з іншага ж боку, семантычная зброя можа пакрысе муціраваць у наўпроставую прапаганду пад уплывам ідэі, што ў барацьбе за ісціну ўсе сродкі прыдатныя. Спараджаючы новы дыскурс і новыя каналы і формы камунікацыі і, такім чынам, здзяйсняючы семантычную рэвалюцыю, тут вельмі істотна не дазволіць ёй захутка ператварыцца ў контррэвалюцыю ідэалагічных змаганняў.

Што з'яўляецца, аднак, зместам новага дыскурсу як зброі ў семантычнай вайне. Паводле Дацюка, гэта метадалагічная інавацыя – якія формы мыслення («мыслеформы») выкарыстоўваць; ідэалагічная – якія ідэі прымаць, а якія адхіляць; светапоглядная – у якой карціне свету, што прымае згаданыя формы і ідэі, жыць; ідэнтыфікацыйная – якія прынцыпы і змест мыслення, што паходзяць з ягонай рэфлексіі, а не сферы бессэнсоўнага, талераваць. Грунтоўным тут будзе агульны пераход да мысленчай устаноўкі на рэфлексію і сэнс ад устаноўкі на агрэсію, прывілеяванасць і бяздумнасць. Апісваючы стан актуальнай семантычнай вайны, якую вядуць украінскія і частка расійскіх інтэлектуалаў супраць бяздумнасці сучаснай расійскай прапаганды, Дацюк апісвае прыклады таго, як павінны весціся баявыя дзеянні семантычнай вайны: навукоўцы мусяць абвяргаць і крытыкаваць неадэкватныя гістарычныя і агулам гуманітарныя канцэпцыі, якія эксплуатуе сучасная расійская прапаганда (канцэпцыю «Рускай дзяржавы», «Русі», «сяброўства славянскіх народаў» і г.д.), інтэлектуалы маюць разбураць архаічны і рэваншысцкі дыскурс Расіі і пазбаўляць яго легітымнасці (выкрываючы фундаментальнае перакручванне паняццяў дэмакратыі, грамадзянства, правоў і г.д., фундаменталізацыю праваслаўя і да т.п.), эксперты ў камунікацыі – выкрываць формы семантычнай няроўнасці і каланіяльны дыскурс, які навязваецца ў расійска-ўкраінскіх дачыненнях дыскурс «старэйшага брата», гістарычных абавязацельстваў перад былой метраполіяй; палітыкі ж – выціскаць з сферы палітычнага дзеяння рэляцыі да гістарычнай праўды і справядлівасці як форму ідэалагічнай маніпуляцыі (напрыклад, справядлівасць павяртання Крыма ў склад Расійскай дзяржавы). Агулам гэта мае на ўвазе жорсткую палітыку ў моўнай практыцы, барацьбу з неадэкватным ужываннем словаў і падменай паняццяў, вынясенне жорсткіх маральных ацэнак тым дзеянням, якія парушаюць прынятыя нормы чалавечнасці (злачынствы гібрыднай вайны).

Падсумаваўшы падыход Сяргея Дацюка, можа сцвярджаць, што падобную практыку крытычнага выказвання і публічнага змагання з прапагандай так ці інакш свядома ажыццяўляюць большая частка незалежных украінскіх і расійскіх інтэлектуалаў і палітыкаў, якія застаюцца імуннымі ад комплекснага ўздзеяння прапаганды,

і паступова іх высілкі прыносяць пэўны плён, але відавочна, што вядзенне падобнай семантычнай вайны – працэс працяглы і малаімклівы, хаця стратэгічна ён апраўданы. Больш цікава тое, чаму яшчэ наогул застаюцца інтэлектуалы, якіх татальная прапаганда не перацягвае на свой бок і якія могуць стаць рэсурсам падобнай семантычнай вайны. Жак Элюль у свой час пісаў, што адрозненні ў палітычных поглядах і рэжымах не такія істотныя для ўплыву прапаганды (і тое можна часта назіраць, калі былыя «дэмакраты» і «лібералы» з лёгкасцю робяцца дзяржаўнікамі, а часам наадварот), сацыяльнае паходжанне тут адыгрывае большую ролю (бо гэта асяроддзе і кругагляд чалавека, звыклае кола камунікацыі), а найбольш тут мае значнасць нацыянальная самасвядомасць (базавая культурная ідэнтычнасць). Рызыкну сцвярджаць, што ўкраінскія інтэлектуалы з відавочнай нацыянальнай ангажаванасцю ці расійскія інтэлектуалы, якія не змешваюць нацыянальную ідэнтычнасць і дзяржаўную прыналежнасць, нашмат больш рэзістэнтныя да ўздзеяння прапаганды, чымся іх паплечнікі з размаітай (няпэўнай, «постсавецкай») ідэнтычнасцю і неразуменнем неадназначнасці сувязяў паміж нацыянальнымі інтарэсамі, патрыятызмам і дзяржаўнай палітыкай. У гэтым пункце ёсць пэўная слабасць аргументаў Дацюка, які бачыць у нацыяналізме пагрозу і заклікае да замены яго грамадзянскай ідэнтычнасцю, што заснаваная на найноўшых эпізодах паўставання ўкраінскай грамадзянскай супольнасці і па сутнасці ігнаруе папярэднюю традыцыю існавання дзяржаўнасці і пэўных форм грамадскасці. Калі Дацюк заклікае да семантычнай вайны з нацыяналістычным дыскурсам, ён нібыта забывае на тое, што небяспека палягае не ў самім нацыяналізме як мабілізацыйнай ідэі мадэрнага грамадства, але ў ягоных рэакцыйных формах супрацьпастаўлення адной нацыі ўсім іншым і ўшанаванні пачуцця нацыянальнай перавагі над астатнімі. Грамадзянскі патрыятызм фактычна выконвае тую ж ролю, што і нацыяналістычны дыскурс, падмяняючы нацыянальную ідэнтыфікацыю грамадзянскай, але гэта не вызваляе яго гэтаксама ад магчымага перакідвання ў рэакцыйныя формы. Таму барацьба з нацыяналізмам і гісторыяй можа ў такім выпадку абярнуцца руйнаваннем наяўнай ідэнтычнасці тых жа ўкраінскіх інтэлектуалаў і іх лепшай падпаласцю пад эфекты прапаганды, у тым ліку прапаганды ўласнай. У гэтым сэнсе добрае разуменне гісторыі, традыцыі і культурных адметнасцей рэгіёна – гэта адзін з фактараў захавання самой пазіцыі крытычнага інтэлектула насуперак розным маніпуляцыям з памяццю. Натуральна, што той жа нацыяналізм звяртаецца да пэўных гістарычных міфаў, якія яднаюць пярэстую супольнасць людзей у інтэграваную еднасць – нацыю і якія ствараюцца інтэлектуаламі на аснове пэўных фактаў і інтэрпрэтацый, але асноўнае тут не працяг свядомага культывавання сацыяльнай міфалогіі, а разуменне крыніц культурнай і нацыянальнай ідэнтычнасці: «Таму зварот да гістарычнага міфа той

альбо іншай супольнасці – адэкватны спосаб распазнання сэнсаў і зместу, што гэтую супольнасць цэментуюць, збіраюць разам»[62].

Гэта не кшталт раней згаданай аўтэнтызацыі як замілаванасці нейкім вобразам гістарычнага мінулага і пакладаннем яго праекцый на сучасную культуру як спроба вывесці нацыянальную ідэю, але адпаведная палітыка памяці і шанаванне ўласнай і чужой культурных адметнасцей. Супрацьстаяць эфектам прапаганды складана, але прынцыпова магчыма і ў гэтым дапамагаюць не толькі формы крытычнага і рэфлексіўнага мыслення, але і трываласць ідэнтычнасці, тае пазіцыі, з якой зрэшты і прамаўляе інтэлектуал, свядома яе прымаючы, не ўзносячы і не прыніжаючы.

***

Такім чынам, калі падвесці пэўныя агульныя высновы, мы можам пабачыць, што на сёння ў экспертных колах ужываюць вялікую колькасць паняццяў для азначэння новага тыпу войнаў без выкарыстання звычайных відаў летальнага ўзбраення: псіхалагічныя, сеткавыя, інфармацыйныя, кібервойны ці камбінаваныя стратэгіі, кшталту, войнаў гібрыдных. Да гэтага спісу можна дадаць і паняцці, што выкарыстоўваюць у асяроддзі расійскай аналітыкі – ананімныя войны, арганізацыйная зброя вайны і, нарэшце, вайна кансцыентальная. Кансцыентальная вайна, з аднаго боку, спалучае тыповыя рысы раней згаданых формаў правядзення ваенных аперацый, але, з іншага боку, яна ў сваім змесце дакладна ўтрымлівае тую рысу, што гэта тып вайны, скіраваны на руйнаванне ці істотнае змяненне свядомасці, ці ідэнтычнасці сучаснага чалавека. Гэта значыць, што дадзены тып войнаў пераважна арыентаваны не на фізічнае вынішчэнне супраціўнікаў, але на стварэнне трывалага эфекту прапаганды на ўласную і чужую аўдыторыю, якая б дазваляла істотна змяняць ментальныя схемы, пераважныя каштоўнасці і спосабы самаідэнтыфікацыі людзей для кіравання і маніпулявання іх паводзінамі. Прапаганда кансцыентальнай вайны робіцца надзвычай дзейснай дзякуючы медыятызацыі свядомасці сучаснага чалавека, то бок немагчымасці правесці дакладнае размежаванне паміж уласнай свядомасцю і экраннай тэхналогіяй, за кошт павелічэння колькасці альтэрнатыўных стратэгій ідэнтычнасці і паслаблення трываласці традыцыйных узораў, пэўнай разарванасці інтэлектуальнага і эмацыйна-каштоўнаснага складнікаў чалавечага мыслення.

Адным з прынцыповых пытанняў для разгортвання тэмы было таксама тое, чаму нават самая рэфлексіўная і крытычна думаючая частка грамадства – інтэлектуалы – робяцца ахвярамі эфектаў прапаганды ў кансцыентальнай вайне? Для адказу на тое пытанне было важна звярнуцца да канцэпцыі сучаснай тэорыі прапаганды Ж. Элюля. Праз гэта было магчыма адшукаць пэўныя адказы на пас-

62 О. Міхайлова: *Украина мыслит о свободе* // Хвиля. Новостной и аналитический портал. Рэжым доступу: http://hvylya.net/analytics/society/ukraina-myislit-o-svobode.html. Дата доступу: 20.10.2016.

таўленае пытанне. Па-першае, непазбежнасць пашырэння экраннай свядомасці на масавую аўдыторыю і ў тым ліку інтэлектуалаў, якія не маюць іншай магчымасці атрымаць доступ да значных падзей, што адбываюцца ў свеце, як толькі пры дапамозе «карцінкі», трансляванай СМІ і таму натуральна скажонай. Па-другое, для часткі інтэлектуалаў важна адчуваць прыналежнасць да сферы прыняцця рашэнняў і выходзіць з зоны дыскамфорту супрацьстаяння з «грамадскай думкай», што ўласна прапаганда і дазваляе рабіць. Па-трэцяе, сучасная прапаганда не столькі схіляе да замены думак у галаве, колькі да прыняцця ўдзелу ў пэўнай наважанай дзейнасці праз прамы ўдзел ці яе адабрэнне, пасля чаго інтэлектуалы самі схільныя да «апраўдання» і легітымацыі сваёй новай пазіцыі, перапісваючы ўласную сістэму каштоўнасцей і ідэй, «рацыяналізуючы» апрычоныя факты грамадскага жыцця. Па-чацвёртае, прапаганда дзейнічае не столькі наўпрост, колькі праз доўгатэрміновую стратэгію «сацыялагічнага» ўздзеяння на сваю аўдыторыю – праз трансляцыю пэўных культурных норм, стандартаў, якія пазней разумеюцца як самавідавочныя і адзіна магчымыя, і гэта фармуе паўставанне пэўнага ладу жыцця, які кладзецца фонам на мысленне інтэлектуала і змушае яго здумляць усё бачанае праз пэўную карціну свету. Па-пятае, спрацоўвае эфект групавой лаяльнасці, калі індывід падпадае пад уздзеянне масавай псіхалогіі і стэрэатыпныя прапагандысцкія клішэ, успрымаючы групавую волю і думку як уласныя. Па-шостае, сёння прапаганда абапіраецца не на канкрэтныя ідэалогіі, а на сінкрэтычны міфалагічны пачатак, які маніпулюе рознымі патэрнамі свядомасці індывіда і робіць тое на узроўні, дзе рацыянальная крытыка і аргументацыя малаэфектыўныя. Як вынік, можна сцвярджаць, што ў сучаснай прапаганды ёсць безліч магчымасцей прамога і непрамога ўздзеяння на індывіда, нават рэфлексіўнага і высокаадукаванага, якія і выкарыстоўваюцца ў часе вядзення кансцыентальных войнаў.

Нарэшце, тады застаецца апошняе пытанне: ці магчыма неяк засцерагчыся ад уздзеяння кансцыентальнай зброі і яе паражальных эфектаў? Тут магчымыя як пасіўныя, так і актыўныя формы абароны. Як часткова дзейсныя і хутчэй рэактыўныя – тэхнікі «аўтэнтызацыі»; доўгатэрміновыя і гіперрэфлексіўныя – «метаэкранныя тэхналогіі»; гэтак і канструктывісцкія, выпраўляльныя тэхналогіі «семантычнай вайны». Усе яны маюць свае як моцныя, так і слабыя бакі і могуць ужывацца паралельна адна адной. Пры гэтым абараняецца думка наконт неабходнасці абапірання на трывалыя аспекты нацыянальнай ідэнтычнасці для ўмацавання ўласнай рэфлексіўна-крытычнай пазіцыі.